Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 14 (470) | Субота, 11 мая 1940 года | Цана 20 кап.

Да ведама ўсіх арганізацый КП(б) Беларусі

Рашэннем Пленума ЦК КП(б)Б адкрыццё чарговага XVIII з'езда КП(б)Б назначана на 15 мая 1940 года.

Парадак дня XVIII з'езда.

1. Справаздачныя даклады: ЦК КП(б)Б—дакладчык тав. П. Панамарэнка, Цэнтральнай рэвізійнай камісіі—дакладчык тав. Седых.

2. Выбары Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. ПАНАМАРЭНКА.

Да XVIII з'езда КП(б)Б

Вялікі беларускі народ з радасным уздымам сустракае XVIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, адкрыццё якога назначана на 15 мая 1940 года.

XVIII з'езд большэвікоў Беларусі падвядзе вынікі гістарычных перамог, велічных поспехаў у социялістычным будаўніцтве, дасягнутых беларускім народам у саюзе братніх совецкіх народаў пад вадзіцельствам партыі Леніна—Сталіна.

XVIII з'езд з новай сілай пакажа сталёвае адзінства радоў магутнай арміі большэвікоў нашай рэспублікі, іх сілу і непахіснасць, іх бязмежную адданасць і гарачую любоў да мудрага правадыра і настаўніка вялікага Сталіна.

XVIII з'езд акрэсліць задачы большэвікоў Беларусі ў барацьбе за далейшы социялістычны росквіт прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры рэспублікі, — за пабеданоснае будаўніцтва комунізма.

Здзейснены мары беларускага народа — ён з'еднаны ў адну сям'ю пад адным палымнеючым сонцам социялізма. І народ, будуючы светлае социялістычнае жыццё на з'еднанай навекі вольнай зямлі, славіць мудрую партыю большэвікоў.

Партыя большэвікоў разбіла ўсялякія прошукі ворагаў, разграміла іх смуродныя гнёзды і забяспечыла няўхільны росквіт і ўмацаванне совецкай зямлі.

Совецкая Беларусь лікуючы сустракае XVIII з'езд КП(б)Б. Ва ўсенародным творчым уздыме ўслаўляюць з'езд стаханаўскім выкананнем вытворчых планаў рабочыя, паспяховым завяршэннем веснавой сяўбы — калгаснікі, працоўнае сялянства, новымі бліскучымі здабыткамі ў будаўніцтве социялістычнай культуры — совецкая інтэлігенцыя.

Адным з выдатнейшых дасягненняў большэвіцкай партыі з'яўляецца рост, загартоўка, ідэйная ўзброенасць кадраў нашай інтэлігенцыі.

І совецкая інтэлігенцыя, авалодваючы марксізмам-ленінізмам, глыбока вывучаючы сталінскі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», адказвае на любоў і ўвагу партыі, усяго совецкага народа натхнёнай працай і творчасцю на карысць вялікай справы комунізма.

Дзякуючы найвялікшым клопатам партыі цудоўнага росквіту дасягнула культура ў нашай рэспубліцы.

Выраслі ідэйна і творча, узбагаціліся шматлікімі выдатнымі творамі наша літаратура і наша мастацтва.

Партыя забяспечыла ўсе ўмовы для плённай творчай працы совецкіх пісьменнікаў. І пісьменнікі Совецкай Беларусі няспынна творча растуць, узбагачаюць совецкую літаратуру таленавітымі творамі.

Новыя, натхняючыя чытачоў і ўслаўляючыя беларускую літаратуру вершы і паэмы напісалі народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас. Высокай ацэнкі заслугоўвае паэтычная дзейнасць П. Броўкі і П. Глебкі — іх вершы, іх оперныя лібрэта. Плённа працуюць у паэзіі А. Куляшоў, З. Аксельрод, П. Панчанка, Э. Агняцвет і многія іншыя творча растучыя паэты. Новымі выдатнымі творамі ўзбагацілі прозу Змітрок Бядуля, Кузьма Чорны, Міхась Лынькоў, Макар Паслядовіч і іншыя пісьменнікі старэйшага і маладшага пакалення. Драматургія папоўнілася п'есамі К. Крапівы, М. Клімковіча, В. Вольскага, П. Глебкі і яшчэ раду драматургаў. Да магутнага голасу совецкай літаратуры далучылі свой голас пісьменнікі заходніх абласцей рэспублікі, здабыўшыя ў совецкай краіне шчасце вольна тварыць. У актыў нашай літаратуры ўваходзяць натхнёныя вершы праслаўленага паэта і народнага выбранніка ў Вярхоўны Совет СССР Філіпа Пестрака, Максіма Танка і многіх таленавітых сыноў вызваленага народа.

Вырас атрад комуністаў-пісьменнікаў. За апошні час у члены партыі прыняты П. Броўка, Э. Агняцвет, у кандыдаты — А. Куляшоў. Гэты рост — таксама яскравае сведчанне згуртаванасці совецкіх пісьменнікаў вакол большэвіцкай партыі. Партыйная арганізацыя Саюза пісьменнікаў разгарнула вялікую работу па ўздыму ідэйнай загартоўкі пісьменніцкіх кадраў. Комуністы-пісьменнікі разам з шырокім актывам беспартыйных разгарнулі глыбокае вывучэнне твораў класікаў марксізма-ленінізма, «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

І ў творчай рабоце комуністам-пісьменнікам належыць пачэснае вядучае месца. Аб гэтым сведчыць творчасць М. Лынькова — у галіне прозы, М. Клімковіча, В. Вольскага, І. Гурскага — у драматургіі, П. Броўкі, А. Куляшова, Э. Агняцвет — у паэзіі, М. Модэля — у крытыцы.

Новымі слаўнымі творчымі поспехамі сустракаюць пісьменнікі Совецкай Беларусі XVIII з'езд КП(б)Б!

Штодзённыя клопаты партыі аб мастацтве забяспечылі яго бурны росквіт, яго выключна значныя поспехі. XVIII з'езд КП(б)Б работнікі мастацтваў сустракаюць завяршэннем велічных творчых работ — твораў, вартых назвы ўзораў мастацтва беларускага народа, дастойных паказу на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Створаны тры беларускія оперы і балет, якія сведчаць аб высокім узроўні беларускай музычнай культуры і здольны заняць пачэснае месца ў радзе лепшых твораў совецкага рэалістычнага мастацтва. Ажыццёўлены пастаноўкі лепшых п'ес беларускіх драматургаў — створаны спектаклі, якія паказваюць высокае майстэрства выраслых на беларускай сцэне актораў, рэжысёраў, мастакоў. Напісаны карціны, створаны скульптуры, якія дэманструюць творчую спеласць нашых майстроў выяўленчага мастацтва.

Гэтыя выключныя па сваёй вартасці здабыткі нашага мастацтва — вынік няўхільнага росту ідэйнай узброенасці і творчага майстэрства работнікаў мастацтваў.

Творчасць народнай артысткі БССР Л. Александроўскай у стварэнні чаруючых вобразаў беларускіх опер, у выкананні народных песень; творчасць народных артыстаў БССР Г. Глебава, В. Уладамірскага, А. Ільінскага, заслужаных артыстаў БССР І. Ждановіч, П. Малчанава, Б. Платонава, З. Васільевай, Р. Млодэк, М. Дзянісава, С. Дрэчына, В. Лапіна, Ю. Аронычык, дзесяткаў іншых таленавітых актораў драматычных і опернага тэатраў, рэжысёраў — засл. арт. рэсп. Л. Рахленка, К. Саннікава, засл. арт. рэсп. М. Зорава, Н. Златагорава, І. Шлепянава, А. Ермалаева, народнага артыста рэспублікі Е. Міровіча, дырыжораў М. Шнейдэрмана, Н. Грубіна і многіх іншых майстроў сцэны, — гэта творчасць услаўляе беларускае мастацтва, з'яўляецца ўзорам аддана га служэння совецкай інтэлігенцыі сваяму вялікаму народу.

Кампазітары Е. Цікоцкі, А. Туранкоў, А. Багатыроў, Н. Аладаў, Н. Шчэглоў, мастакі і скульптары засл. дзеячы мастацтваў В. Волкаў, А. Грубэ, З. Азгур, а таксама М. Манасзон, Е. Зайцаў, Н. Пашкевіч, Б. Малкін, паэты-лібрэтысты П. Броўка, М. Клімковіч, П. Глебка і разам з імі сотні работнікаў усіх галін мастацтваў далі бліскучыя прыклады барацьбы за магутны ўздым і росквіт беларускага социялістычнага мастацтва.

Шмат лепшых прадстаўнікоў совецкай мастацкай інтэлігенцыі прынята ў рады большэвіцкай партыі. І ўвесь слаўны атрад работнікаў мастацтваў з'еднаны вакол партыі, бязмежна адданы ёй.

Абласканае любоўю краіны социялізма, увагай партыі, шпарка расце мастацтва, развіваецца творчасць шчаслівага народа нашых заходніх абласцей. У гэтых абласцях ужо плённа працуюць тэатры, музычныя ансамблі, тысячы гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Зроблена шмат. Але наперадзе — вырашэнне яшчэ больш складаных задач, наперадзе — барацьба за новыя поспехі літаратуры, мастацтва і ўсіх галін культуры совецкага народа. Новыя грандыёзныя творчыя перспектывы адкрыты большэвіцкай партыяй і совецкім урадам перад пісьменнікамі і работнікамі мастацтваў. І гэта патрабуе няспыннай работы па ўзбагачэнню нашых кадраў літаратуры і мастацтваў ведамі марксізма-ленінізма па ўдасканаленню іх майстэрства і клапатліваму выхаванню творчай моладзі.

Пісьменнікі, работнікі мастацтваў разам з усім беларускім народам горача вітаюць XVIII з'езд Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі!

Слава вялікай партыі Леніна—Сталіна!



П. І. Чайкоўскі — Малюнак Н. Гурло.

ВЯЛІКІ РУСКІ КАМПАЗІТАР

7 мая 1940 года совецкая грамадскасць адзначыла 100-гадовы юбілей геніяльнага рускага кампазітара Пятра Ільіча Чайкоўскага.

П. І. Чайкоўскі нарадзіўся на Урале, у горадзе Воткінску, дзе бацька яго служыў дырэктарам завода.

Не гледзячы на рана выяўленыя музычныя здольнасці дзіцяці, ніхто з блізкіх не думаў, што імя Чайкоўскага ў будучым стане гордасцю і славай рускага мастацтва. Мастацкія ўражанні будучага кампазітара былі нешматлікія ва ўмовах правінцыяльнага жыцця—спачатку ў Воткінску, а затым на Алапацьеўскіх рудніках, куды пераехала сям'я Чайкоўскага. Бацька прывёз з Пецярбурга механічны інструмент—аркестрыну, якая выконвала арыі Расіні і Моцарта. Моцарт стаў першай музычнай страсцю Чайкоўскага, і ён захаваў яе да канца жыцця.

Ва ўзросце дзесяці год Чайкоўскі ўжо добра іграў на раялі. Аднак, яму прадракалі іншую дарогу. Яго бацька, Ілья Пятровіч, які атрымаў назначэнне ў Пецярбург, аддаў сына ў вучылішча правазнаўства для падрыхтоўкі к дзяржаўнай службе. У школьныя годы з 1850 па 1859, Чайкоўскі прадаўжае браць урокі фортэп'яннай ігры. Па сканчэнні вучылішча ён пачынае службу ў міністэрстве юстыцыі, а ў 1862 годзе паступае ў Пецербургскую кансерваторыю, заснаваную Антонам Рубінштэйнам. Чым глыбей нагружаўся ён у вывучэнне мастацкай культуры, тым невыносней станавілася для яго затхлая атмасфера бязрадаснай чыноўніцкай службы. Ён парывае з міністэрствам і становіцца на шлях кампазітара-прафесіянала.

У 1865 годзе на выпускным экзамене кансерваторыі выконваецца кантата Чайкоўскага на тэкст оды Шылера «К радасці». Маладому кампазітару прысуджана сярэбраная медаль. Хутка ён атрымлівае запрашэнне заняць месца прафесара Маскоўскай кансерваторыі.

Больш дзесяці год правёў Пётр Ільіч у Маскве, развіваючы энергічную дзейнасць кампазітара, музычнага крытыка, выхавальніка моладзі ў сценах кансерваторыі. За гэты, так званы маскоўскі, перыяд творчасці Чайкоўскім створаны тры сімфоніі, уверцюра-фантазія «Рамео і Джульета», сімфанічныя творы «Бура» (па Шэкспіру) і «Франчэска да Рыміні» (па Дантэ), оперы «Ваявода», «Ундзіна», «Апрычнікі», «Каваль Вакула», балет «Лебядзінае возера», тры квартэты, рад выдатных рамансаў.

У гэтых творах ўстае перад намі аблічча мастака-рэаліста, які горача любіць жыццё.

У 1878 годзе кампазітар пакідае Маскоўскую кансерваторыю, доўга жыве за граніцай—у Італіі, Швейцарыі. У якасці дырыжора ён робіць падарожжы па Еўропе. Але яго заўсёды цягне ў Расію. З 1885 года Чайкоўскі пасяляецца ў ваколіцы Масквы — у Майданаве, а затым у Кліну. За некалькі дзён да смерці ён дырыжыраваў сваёй апошняй, шостай «патэтычнай» сімфоніяй. Памёр Чайкоўскі 25 кастрычніка 1893 года.

Пакінутая Чайкоўскім творчая спадчына вельмі вялікая і разнастайная. Ім напісана восем опер (не лічачы ранніх работ у гэтай галіне): «Апрычнікі», «Чаравічкі», «Еўгеній Онегін», «Чарадзейка», «Арлеанская дзева», «Мазепа», «Пікавая дама», «Іоланта»; тры балеты: «Лебядзінае возера», «Спячая красуня», «Шчаўкунчык»; музыка да казкі Астроўскага «Снягурачка»; сем сімфоній; пяць сімфанічных паэм і тры сюіты для аркестра; тры канцэрты для фортэп'яна з аркестрам і адзін для скрыпкі з аркестрам; варыяцыі для віяланчэлі на тэму «Ракоко»; секстэт, тры струнных квартэты, адно трыо, некалькі серый рамансаў, харавых твораў і шмат дробных фортэп'янных п'ес.

Чайкоўскі каштоўны нам перш за ўсё тым, што ён па-сапраўднаму ведаў і любіў вялікі рускі народ. Яго творчасць наскрозь прасякнута рускай народнай песняй.

Абаянне музыкі тварца любімейшых опер і сімфоній — перш за ўсё ў шчырасці і праўдзівасці яе. Ён паспяхова працаваў ва ўсіх музычных жанрах. Оперы, балеты, сімфоніі, сюіты, рамансы, квартэты, п'есы для раяля, для скрыпкі,—усё яму ўдавалася, усюды ён сказаў сваё новае слова, усюды пакінуў глыбокі след, чым аказаў велізарны ўплыў на далейшае развіццё музычнай культуры.

А. ДЭМБО.



Мастак Е. А. Зайцаў за работай над карцінай «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 годзе», якая будзе прадстаўлена на выстаўцы ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Фотарэпрадукцыя М. Савіна (БЕЛТА).

НАРОДНАЯ ПЕСНЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ЧАЙКОЎСКАГА

Чайкоўскі — мастак шырокага творчага дыяпазону. Сімфанічная, оперная, балетная, камерная музыка, — вось спадчына вялікага кампазітара. Спалучаючы ў сваёй творчасці традыцыі класічнага стылю з дасягненнямі перадавых заходнееўрапейскіх рамантыкаў, Чайкоўскі выпрацаваў свой ярка арыгінальны музычны стыль, рашаючае значэнне ў якім мела сувязь з рускай нацыянальнай музычнай школай, з рускай і украінскай народнай творчасцю — з сялянскай і гарадской песняй.

Знаёмства Чайкоўскага з рускім фальклорам прыпадае яшчэ на годы яго прабывання ў Воткінску і Алапацьеўску, дзе праходзіла маленства кампазітара. Аб гэтым сведчыць кампазітар у сваім пісьме да мецэнаткі фон-Мекк:

«Што датычыць рускага элементу ў маёй музыцы, г. зн. блізкіх з народнай песняй прыёмаў у мелодыі і гармоніі, дык гэта адбываецца з прычыны таго, што я вырас у глушы, з маленства самага ранняга пранікнуўся невыказнай прыгажосцю характарыстычных рысаў рускай народнай музыкі, што я страсна люблю рускі элемент ва ўсіх яго праяўленнях...»

Пазней частыя паездкі Чайкоўскага ў Кіеўскую губерню да сваёй сястры Давыдавай — у маёнтак Каменку — далі магчымасць кампазітару пазнаёміцца і з украінскім фальклорам.

Знаёмства-ж Чайкоўскага з гарадскім фальклорам, з гарадскім рамансам мае сваю гісторыю. У 1866 годзе, калі Чайкоўскі перасяляецца ў Маскву, ён, як вядома, наладжвае моцную сувязь з артыстычным гуртком драматурга Астроўскага і артыста Садоўскага, у асобе якіх малады кампазітар знайшоў аўтарытэтнейшых знаўцаў рускай народнай песні, ад якіх ён запазычыў некаторыя музычна-фальклорныя запісы, з якімі ён раіўся па пытанню аб сапраўднасці выкарыстоўваемых песень. Сувязь з артыстычным гуртком дапамагла Чайкоўскаму глыбей, паўней вывучыць узоры старажытна-сялянскай песні, а таксама і ўзоры сучаснага яму гарадскога раманса. Чайкоўскі не грэбаваў бытавой музыкай, наадварот, ён браў яе за аснову сваіх твораў і шліфаваў да ступені найвялікшай дасканаласці (што выклікала нездаволенне «кучкістаў», якія ў сваёй творчасці выкарыстоўвалі толькі сялянскія песні).

Такім чынам, рускі і украінскі фальклор ва ўсіх яго праяўленнях адыграў немалаважную ролю ў фарміраванні творчай асобы кампазітара і з'яўляецца адной з жыватворчых крыніц, харчуючых музычную творчасць Чайкоўскага. Чайкоўскі сам адзначае, што яму нярэдка здаралася проста прыступаць да твора, маючы на ўвазе распрацоўку той ці іншай спадабаўшайся яму народнай песні. Фальклор у Чайкоўскага ніякім чынам не цытата, не стылізаваная дэкарацыя і ўжо зусім не засцэнаграфіраваны сыры матэрыял (успомнім распрацоўку рускай народнай песні «Во поле березынька...» У фінале IV-й сімфоніі ў адрозненне ад распрацоўкі гэтай тэмы ў Балакірэўскай фантазіі), ён — дзейсны элемент, галоўны ўдзельнік у стварэнні музыкальна-паэтычнага вобраза, ён — матэрыял для лірыка-драматычнага выказвання асабістага перажывання кампазітара.

Па выражэнню самога Чайкоўскага, «народная песня толькі семя, з якога мастак можа, пры ўмове таленту і ведаў, вырасціць раскошнае дрэва».

Народная песня ў Чайкоўскага, несучы аптымістычны, светлы настрой, супрацьстаіць змрочнаму філасофска-сузіральнаму настрою кампазітара. «Калі ты ў самім сабе не знаходзіш матываў для радасці, глядзі на іншых людзей. Ідзі ў народ. Глядзі, як ён умее весяліцца, аддаючыся бязмежна радасным пачуццям», — гаварыў Чайкоўскі. Руская народная песня «Цвели цветики» служыць яму матэрыялам для ўступу і імклівай старонняй партыі 1-й сімфоніі; украінская народная песня «Журавель» (праспяваная ў Каменцы старым буфетчыкам, якога Чайкоўскі жартам называў «сапраўдным кампазітарам» сімфонія, — тэмай для вынаходлівай варыяцыйнай распрацоўкі, — спачатку ўрачыста-жартаўлівай, затым паступова набываючай сапраўды плясавы характар, — II-й сімфоніі; руская народная песня «Во поле березынька...» — тэмай для выражэння народнай весялосці ў IV-й сімфоніі; руская народная песня «Под яблоней зеленой» — тэмай для распрацоўкі ў серэнадзе для струннага аркестра.

Вядома, зацікаўленасць Чайкоўскага народнай песеннай творчасцю не абмяжоўваецца толькі выкарыстаннем яе ў сімфанічнай творчасці. Руская і украінская народная песня ўваходзіць і ў яго оперы, дзе яна часта, асабліва ў раннім перыядзе творчасці, замяняе арыі адбываецца ў выглядзе хораў і плясак, напрыклад, песня Наталлі ў оперы «Апрычнікі», песня п'янага казака ў оперы «Мазепа», хоры сялян ў І-й дзеі оперы «Еўгеній Онегін», песні ў оперы «Чаравічкі», у музычнай драме «Снягурачка», і г. д.

Між іншым, Чайкоўскі часта не столькі прытрымліваецца сапраўды народных мелодый, колькі народных інтанацый; тут праяўляецца яго творчая чуласць да стварэння твораў у духу фальклорных вобразаў і форм. Ён выступае не як «апрацоўшчык» фальклору, а як актыўны яго тварэц, ён паказвае вышэйшую ступень авалодання народнай музычнай мовай, ён ілюструе ўсім вядомы тэзіс Стасава, што «музыка не заключаецца ў адных тэмах; для таго, каб быць народнай, каб выражаць нацыянальны дух і душу, яна павінна адрасоўвацца к самаму кораню жыцця народнага».

І на падставе так званага «рускага» элементу ў Чайкоўскага ўзнікаюць поўныя выключнай меладычнай фантазіі багатага рытмічнага жыцця і рэдкага лірычнага хараства сапраўдныя шэдэўры музычнага мастацтва, — такімі з'яўляюцца тэмы двух першых частак 1-й сімфоніі, навеяныя меланхалічным зімовым пейзажам; светлыя, летуценныя тэмы 2-й часткі IV-й сімфоніі; тэма варыяцый фортэп'яннага трыо памяці Рубінштэйна, навеяная ўспамінамі аб сельскім свяце, што мела месца ў гонар пастаноўкі «Снягурачкі» (за 9 год да напісання трыо), і рад іншых тэм са шматлікай спадчыны вялікага кампазітара-рэаліста.

Асобна трэба прыгадаць, што ў 60—70-я годы Чайкоўскі выступае і як апрацоўшчык народнай песні. У 1869 годзе ён выпускае зборнік 50 рускіх народных песень для фортэп'яна ў чатыры рукі. Крыніцай фальклорнага матэрыялу паслужылі для яго вядомыя зборнікі Балакірэва і Вільбоа.

Апрача таго, Чайкоўскі рэдакціруе і гарманізуе вялікую колькасць народных песень для зборніка Мамантавай («Дзіцячыя песні на рускія і маларасійскія напевы», 1872 год) і Пракуніна («65 рускіх народных песень», 1872—1873 годы).

Рэзюміруючы, можна адзначыць, што народнаму песеннаму меласу Чайкоўскі абавязан вельмі многім. Іменна народная песня адарыла Чайкоўскага рэльефнай, рэалістычна-выразнай задушэўнай мелодыкай, дапамагла Чайкоўскаму перамагчы разрыў пам'ж «высокай» і бытавой музыкай, прывяла яго да высокага музычнага майстэрства.

Мара Чайкоўскага аб магчымасці зрабіць музыку здабыткам «не толькі паасобных гурткоў, але і ўсяго народа» атрымала ўвасабленне ў наш час, калі мастацтва належыць народу, калі яно ідзе сваімі найглыбейшымі каранямі ў глыб шырокіх народных мас, калі яно зразумела масам і любіма імі. Наш народ любіць музычную спадчыну Чайкоўскага, бо яна адпавядае тым высокім патрабаванням, якія прад'яўляюцца мастацтву Совецкага Саюза, — яна рэалістычная, праўдзівая і высокая па сваёй мастацкай якасці.

Беларускія совецкія кампазітары глыбока вывучаюць майстэрства Чайкоўскага і вучацца ў яго любві к народнай песні, асваенне якой вядзе да высокага музычнага майстэрства, да стварэння рэалістычных, ідэйна-насычаных і праўдзівых вобразаў.

С. НІСНЕВІЧ.

Чайкоўскі ў чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці

Любімы народам вялікі рускі кампазітар П. І. Чайкоўскі ніколі не быў у баку ад увагі байцоў Чырвонай Арміі і заўсёды карыстаўся ў чырвонаармейскай аўдыторыі, у калектывах мастацкай самадзейнасці вялікай павагай і любоўю.

Няма ні аднаго духавога аркестра, дзе-б у рэпертуары не было твораў Чайкоўскага, цяжка сустрэць спевака, спявачку, баяніста, піяніста ў самадзейнасці, якія-б не выконвалі п'ес, рамансаў Чайкоўскага.

Велізарная глыбіня, лірычная шчырасць, прастата, давядзеная да геніяльнай дасканаласці формы і зместу тварэнняў вялікага музыканта заўсёды прыцягвалі да сябе вялікае кола выканаўцаў з асяроддзя чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. Акрамя таго, Чайкоўскі быў заўсёды зразумелым, ясным любой аўдыторыі.

Работа над творамі кампазітара Чайкоўскага патрабуе вялікай усідчывасці, падрыхтаванасці і культуры выканання, музычнага чуцця і разумення вобраза тварэння, а таму наяўнасць ў рэпертуары чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці яго твораў падкрэслівае рост культуры музычнага выканання ў самадзейнасці Чырвонай Арміі.

Цяжка сказаць, калі паявіўся Чайкоўскі ў мастацкай самадзейнасці часцей, можна, бадай, беспамылкова вызначыць, што ён у асяроддзі чырвонаармейскіх артыстаў з даўняга часу, з першых дзён зараджэння ў Чырвонай Арміі мастацкай самадзейнасці.

Можна пералічыць дзесяткі калектываў, салістаў вакалу і інструментальнага мастацтва, якія налічваюць у сваіх праграмах вялікую колькасць твораў гэтага генія рускай музычнай культуры.

Самадзейны сімфанічны ансамбль пад кіраваннем чырвонаармейца Гардзіенка ў доўгай і клапатлівай рабоце, у свабодныя гадзіны ад баявой падрыхтоўкі, вывучыў рад твораў кампазітара: вальс з «Лебядзінага возера», раманс № 5, фантазію з «Шчаўкунчыка». Асобныя творы Чайкоўскага выконваюць на баянах чырвонаармейцы Аўсяннікаў, Ванчугін, Тугалукаў. Фортэп'янныя рэчы вывучаў чырвонаармеец Топчыеў, жонка камандзіра Скарабагатава. Рад спевакоў і спявачак — Гельман, Дзянісаў, Сабельнікаў, Клюеў, Гарыленка, Чабрава маюць у сваім рэпертуары арыі з опер, рамансы, песні Чайкоўскага. Духавы аркестр пад кіраваннем Марэнзіча падрыхтаваў вялікую праграму аркестровых твораў: фінал з IV сімфоніі, італьянскае капрычыё, акампанементныя партыі з «Пікавай дамы», «Еўгенія Онегіна» і рад інш.

Самадзейнасць воінскіх часцей і духавыя аркестры сустрэлі слаўны юбілей П. І. Чайкоўскага выкананнем твораў з яго выдатнай спадчыны.

Вл. МУРАТ.

Е. СІКАР

Геніяльны твор

Напярэдадні юбілея калмыцкага эпаса „Джангар“

Набліжаецца 500-я гадавіна стварэння калмыцкага народнага эпаса «Джангар». Святкаванне 500-годдзя найвялікшага тварэння братняга калмыцкага народа выліваецца ва ўсесаюзнае культурнае свята. У азнаменаванне 500-годдзя «Джангара» у Элісце, сталіцы Калмыкіі, у маі бягучага года склікаецца юбілейны пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР.

Буйнейшым укладам у літаратуру да 500-годдзя «Джангара» з'явіцца першы поўны мастацкі пераклад эпаса на рускую мову, зроблены паэтам С. Ліпкіным. Пераклад гэты стаіць на высокім паэтычным узроўні і з'яўляецца буйнай творчай перамогай С. Ліпкіна.

Калмыцкі народ па праву можа ганарыцца сваім бессмяротным тварэннем, якое з'яўляецца яркім сведчаннем яго бязмежнай творчай фантазіі, велізарнага паэтычнага таленту. Гэты эпас, бясспрэчна, належыць да ліку шэдэўраў сусветнай эпічнай паэзіі.

Гісторыя не захавала ніякіх вестак аб першых творцах—імправізатарах эпаса. Вядома, што «Джангар» склаўся, як адно велічнае закончанае цэлае, у 40-х годах XV стагоддзя. Гэта быў адзін з самых светлых перыядаў у шматвяковай калмыцкай гісторыі, калі народ дасягнуў свайго найбольшага росквіту і магутнасці. У гэты час калмыцкі палкаводзец Эсен сабраў пад сваёй уладай усе сілы нацыі для вызвалення роднай зямлі ад гнёту дынастыі імператарскага Кітая.

У напружанай барацьбе расла і мацнела нацыянальная самасвядомасць калмыцкага народа. Калмыкі ўсё больш пранікаліся неабходнасцю дзяржаўнага адзінства ў мэтах абароны радзімы і рашучага адпору яе ворагам. І калі чужаземныя прыгнятальнікі былі выгнаны з межаў роднай краіны, стварылася першая калмыцкая вандроўная дзяржава пад назвай «Саюз чатырох братніх плямён». Нарадзіўшыяся ў глыбокай старажытнасці і бытаваўшыя ў народзе песні «Джангара» у гэты знамянальны перыяд былі вусна аформлены ў адзін з цудоўнейшых перлаў сусветнага эпасу.

Бясспрэчна, «Джангар» у нейкай ступені ўвабраў у сябе ўсё ідэальнае з жывой рэчаіснасці той эпохі. Перад нашымі вачамі ўзнікаюць красачныя карціны ваенных перамог, паходаў, бітваў, подзвігаў і спаборніцтваў калмыцкіх багатыроў. Джангарчы — галоўныя захавальнікі і стваральнікі эпаса — з вялікай мастацкай сілай, любоўю і спачуваннем расказваюць аб сваіх нацыянальных героях-багатырах, верных сынах радзімы, абаронцах яе незалежнасці, увасобіўшых высокія маральныя якасці народа.

Велізарная эпапея састаіць з дванаццаці песень, звязаных паміж сабою агульнымі дзеючымі асобамі. Падобна «Слову аб палку Ігаравым» калмыцкі эпас мае зачын — паэтычную прэлюдыю і канцоўку — шастры, у якой джангарчы спяваюць хвалу героям.

Кожную песню «Джангара» можна разглядаць як самастойны твор, які здзіўляе кампазіцыйнай закончанасцю, храналагічнай паслядоўнасцю, выключнай паэтычнасцю вобразаў герояў, носьбітаў высокіх ідэалаў. Колькі разнастайных элементаў у гэтым складаным эпасе, які прайшоў усе стадыі цыклізацыі! У «Джангары», як і ў «Слове аб палку Ігаравым», як і ў «Давіду Сасунскім», глыбокія сляды аміністычнага і татэмістычнага светаразумення. Але ўся гэта старажытная міфалагічная стыхія служыць магутным сродкам для паказу і сцвярджэння сілы і непераможнасці народа.

У адпаведнасці з 12-цю песнямі «Джангара» ў ім 12 галоўных народных багатыроў, якія з'яўляюцца ўзорам дружбы, адзінства, калектыўнасці і мужнасці ў барацьбе і ў выпрабаваннях. Важна адзначыць, што ўсе героі поўны жыццёвай і баявой энергіі і на ўсім працягу эпаса дзейнічаюць як ахоўнікі радзімы і народа, як патрыёты і змагары за чалавечае шчасце. Такі цэнтральны герой Джангар, імем якога названы эпас. Джангар—любімы народам правадыр, вялікі палкаводзец, багатыр выключнай сілы. Джангар—асоба легендарная, казачная, але ў ім ёсць і рысы падабенства з вялікімі палкаводцамі Усходу — Чынгіс-ханам і Тімурам, з народным палкаводцам Эсенам, які адыграў буйную ролю ў гісторыі Калмыкіі. Аб гэтым сведчыць не толькі агульны характар іх дзейнасці, але і рад аўтабіяграфічных даных.

Бліжэйшыя сартнікі Джангара—багатыры Хонгор, Алтан Цэджы, Савар Цяжкарукі, Санал, Мінгіан, Джылган, Энгей Бій. Усе яны змагаюцца супроць знешніх ворагаў, якія пасягаюць на свабоду радзімы. Яны гэтакія-ж бясстрашныя, мужныя, вялікадушныя і благародныя, як Джангар. Але ў той-жа час кожны з багатыроў валодае толькі яму ўласцівымі здольнасцямі, спалучае ў сабе рад тыповых рысаў цэлага народа. Так, Алтан Цэджы — мудры, ясны правідзец. Ён не раз папярэджвае небяспеку, якая пагражае роднай зямлі. Сваімі разумнымі парадамі Цэджы вырашае самыя спрэчныя справы, дапамагае ў выкананні баявых задач воінаў-багатыроў, паказвае ім шляхі для перамагання цяжкіх перашкод. Санал—увасабленне вынослівасці і разважлівасці. Дзякуючы іменна гэтым рысам ён і перамагае полчышчы ворагаў, з гонарам спраўляецца з даручэннямі Джангара.

Савар Цяжкарукі — сімвал спрыту і сілы, беззаветны патрыёт. Мінгіан—прыгажун свету, лепшы пясняр краіны. Вельмі цікавы пранікнёны вобраз друга Джангара—доблеснага багатыра Хонгора, які служыць узорам высокага разумення вернасці радзіме. У вобразе Хонгора працоўны народ Калмыкіі найбольш поўнакроўна ўвасобіў свой ідэал гераічнай мужнасці, беззаветнага патрыятызма, высокага гуманізма і свабодалюб'я. І не дзіўна, што гэты вобраз натхняў калмыкаў у іх барацьбе са знешнімі ворагамі, што яму прысвечана больш за ўсё вершаў эпаса—амаль чатыры песні.

Сіла і значэнне калмыцкага эпаса не толькі ў займальнасці сюжэта, не толькі ў глыбока народным характары яго вобразаў, а і ў тым, што ён будучы глыбока рэалістычным па сутнасці, багата расквечан фарбамі таго «рамантызма, які ляжыць у аснове міфа і высока карысны тым, што спрыяе ўзбуджэнню рэвалюцыйных адносін да рэчаіснасці, адносін, якія практычна змяняюць свет» (М. Горкі).

Глыбокі сацыяльны сэнс мае паэтычны вобраз краіны Бумбы, у якой жывуць і змагаюцца Джангар і яго багатыры. У старых войлачных кібітках, у холадзе і голадзе качэўнікі стваралі гэту цудоўную легенду пра абяцаваную краіну Бумбу, краіну вечнай маладосці і неўміручасці, шчасця і багацця.

Вось, напрыклад, як жыва, поўнакроўна рысуе народ гэту шчаслівую краіну, краіну-мару, дзе людзі жывуць «нічога не дзелячы на маё і тваё»:

Солнце бессмертия засияло над ней.
Счастья и мира вкусила эта страна,
Где неизвестна зима, где всегда весна,
Где, не смолкая, ведут хороводы свои
Жаворонки сладкогласные и соловьи,
Где и дожди подобны сладчайшей росе,
Где неизвестна смерть, где бессмертны все,
Где небеса в нетленной сияют красе,
Где неизвестна старость, где молоды все,
Благоуханная, сильных людей страна,
Обетованная богатырей страна.

Усе народы могуць знайсці ў сябе такую-ж мару аб лепшым шчаслівым жыцці, бо ўсе народы роўна на працягу многіх год шукалі шчасце. Казахі ў сваёй вуснай паэзіі марылі аб цудоўнай краіне «Жэр'уюк», дзе няма ні гора, ні слёз, ні гвалту, што нават «жаўранак можа віць гняздо і несці яйкі на цёплай спіне барана». З вялікай сілай выражаны светлыя надзеі на сваё нацыянальнае адраджэнне ў армянскім эпасе «Давід Сасунскі», дзе апошні сасунскі храбрэц Мгер уваходзіць у глыб рассечанай ім скалы ў чаканні таго шчаслівага часу,—

Когда разрушится мир и воздвигнется вновь,
Когда будет пшеница, как лесной орех,
Как шиповника ягода, будет ячмень.

Сюжэтная лінія эпаса «Джангар» ідзе па трох асноўных напрамках: бытавы паказ шчаслівай краіны Бумбы, у якой жывуць героі-багатыры; паказ смелай, беззаветнай барацьбы супроць захватчыкаў і гвалтоўнікаў, якія рабілі замах на Бумбу; нарэшце, паказ казачных подзвігаў асобных багатыроў, змагаючыхся за справядлівасць і шчасце. У Бумбы шмат магутных ворагаў, якія нічым не пагарджаюць для ажыццяўлення сваіх намераў. Адсюль натуральна, што багатыры Бумбы заўсёды на варце. І гэта лепш за ўсё выяўляецца ў вобразе народнага правадыра Джангара. Чулым сэрцам Джангар неаднаразова прадугадвае насоўваючуюся вялікую небяспеку і запальвае мужнасцю сэрцы воінаў народа, «ахоўваючых радзіму моцнай сцяной». Бясстрашны багатыр, Джангар нечакана пачынае праліваць слёзы. Плач Джангара хвалюе, тры-



Ілюстрацыя **В. Фаворскага** да юбілейнага выдання «Джангара» у рускім перакладзе С. Ліпкіна. На малюнку — герой эпаса багатыр Хонгор.

Фотахроніка ТАСС.

вожыць яго раць. Байцы стараюцца давядацца аб прычыне слёз і Джангар паведамляе, што рыхтуецца напад варожага войска на родную зямлю. Плач вырастае ў сімвал напружанасці народа ў барацьбе з ворагамі, у своеасаблівую тактыку правадыра. Ён узмацняе ў багатыроў пачуццё абавязку перад радзімай, узбуджае іх энтузіязм.

Каб зразумець і па дастоінству ацаніць калмыцкіх багатыроў, трэба азнаёміцца з іх мудрай і гордай прысягай. У кароткіх, чаканных строфах прысягі выражан увесь гераічны народны характар. Наўрад ці можна знайсці чалавека ў Калмыкіі, які-б не ведаў прысягі Джангара і яго багатыроў:

«Жизни свои острию копья предадим,
Мысли свои державе родной посвятим;
Да отрешимся от зависти, от похвальбы,
От затаенной вражды, от измен, от алчбы:
Груди свои обнажим, и вынем сердца,
И за народ отдадим нашу кровь до конца;
Верными Джангару, едиными будем вовек
И на земле будем жить, как один человек;
Да никогда богатырь не кинется вспять,
Вражью завидев неисчислимую рать;
И да не будет коня у него, чтоб не мог
Вихрем взлететь на самый высокий отрог;
Да никогда, никому бы страшна не была
Сила железа, каленного добела».

Са здзіўляючай сілай перагукваецца гэта прысяга, народжаная народам у працэсе шматвяковай гераічнай барацьбы, з ваеннай прысягай сучасных совецкіх багатыроў — байцоў Чырвонай Арміі, гатовых «да апошняга дыхання быць адданым свайму Народу... выступіць на абарону сваёй Радзімы... абараняць яе мужна, умела, з дастоінствам і чэсцю, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагамі».

Мы прысутнічаем пры велізарным росквіце старажытных, сапраўды народных, гераічных традыцый, якія аказаліся актуальнымі ва ўсіх адносінах. Іменна гэтыя традыцыі робяць нацыянальныя эпасы, створаныя народам шмат стагоддзяў назад, блізкімі і зразумелымі працоўным краіны соцыялізма.

Прысягнуўшы мужна выконваць воінскі абавязак, калмыцкія багатыры становяцца вышэй асабістых крыўд, кіруюцца толькі інтарэсамі радзімы. Дзе-б ні знаходзіліся Джангар, Хонгор, Савар, Мінгіан, Санал, дзе-б ні вандравалі багатыры, усюды яны думаюць аб сваёй радзіме, турбуюцца аб яе лёсе.

Увесь эпас прасякнут ідэяй еднання, калектыўнасці ў барацьбе за радзіму і ў гэтых адносінах перагукваецца з геніяльнай паэмай XII стагоддзя—«Словам аб палку Ігаравым». Сіла калмыцкіх багатыроў — у нацыянальным адзінстве, у глыбокай веры ў народны калектыў, якому павінна быць падпарадкавана і асабістая сіла і гераізм. Карл Маркс, які праявіў жывейшую цікавасць да «Слова аб палку Ігаравым», пісаў аб ім: «Сэнс паэмы—заклік рускіх князёў да еднання якраз перад нашэсцем манголаў».

У «Джангары» героі смела ідуць у бой з ворагам, стойка ахоўваюць рубяжы роднай зямлі ад незлічоных полчышчаў, таму што ўпэўнены, што за імі стаіць народ, які дапаможа, аддасць патрэбнае іх патрыятычным подзвігам. У мастацкіх вобразах, якія складаліся стагоддзямі, народ апаэтызіраваў дзяржаўнае адзінства як велізарную жыццёвую сілу, што забяспечвае славу і непераможнасць.

Сама нацыянальная мастацкая форма песень эпаса забяспечвала ім шырокую папулярнасць у народных масах. Асаблівай увагі заслугоўвае разнастайнасць паэтычных фарбаў, багатая аркестроўка вершаў, гучанне рыфмы. Тэкст велічнага эпаса—часам суцэльны ўзор паўтораў.

Асабліва варта адзначыць разнастайную і красачную сімволіку «Джангара», казачную гіпербалізацыю, якая надае эпасу манументалізм, што выражае сілу і магутнасць калмыцкага народа.

Выдатны нацыянальны твор, акружаны сталінскімі клопатамі і любоўю, бясспрэчна стане здабыткам самых шырокіх працоўных мас.

Е. ЗОМЕРФЕЛЬД. І. КУСЦЕРАЎ

ВОБРАЗЫ „НОВАЙ ЗЯМЛІ“ Я. КОЛАСА

Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» да гэтага часу з'яўляецца неперавзыйдзеным паэтычным тварэннем у беларускай літаратуры.

Часта «Новую зямлю» называюць аўтабіяграфічнай паэмай. Нам здаецца, што хоць тут і многа аўтабіяграфічных момантаў, аднак значэнне паэмы выходзіць за рамкі біяграфіі і набывае значэнне твора, у якім адлюстравана тыповае сялянскае жыццё дарэвалюцыйнай Расіі.

Гэты выдатны эпічны твор, шчодра сагрэты цёплай лірыкай сапраўднага паэта, працягвае рэалістычныя традыцыі пушкінскага верша, знамянуе сабою кроўную сувязь з вялікай рускай літаратурай.

Такія кнігі, як «Новая зямля», не старэюць. І хоць імкненні совецкіх людзей далёкі ад імкненняў Міхала, але яго жыццё, яго спадзяванні, раскрытыя з такой праўдзівай сілай паэтам, не могуць не хваляваць нас.

«Новая зямля» дорага нам шырокім паказам жыцця розных слаёў дарэвалюцыйнага грамадства, здзіўляюча метка схвачанымі зарысоўкамі бытавых сцэн, раскрыццём дзіцячай псіхалогіі, шматлікімі малюнкамі родных пейзажаў.

Велізарнае лексічнае багацце, канструкцыя фразы і дакладнасць ужывання слова Коласам аказалі вялікі ўплыў на развіццё беларускай літаратурнай мовы.

«Новая зямля», якая заключае ў сабе звыш 10 тысяч радкоў, — вынік 12-гадовай работы Коласа. Паэма, пачатая яшчэ ў 1911 годзе ў турэмнай камеры, куды царскі ўрад захаваў няўгоднага яму паэта, была закончана ўжо ў вольнай краіне, у 1923 годзе.

Час, у які адбываюцца падзеі «Новай зямлі», прадстаўляе канец XIX і пачатак XX стагоддзя; месца дзеяння — адзін з куткоў Беларусі, непадалёку ад ракі Нёмана.

Змест паэмы агульнавядомы. У ёй паказана жыццё малазямельнага селяніна Міхала, які ў пошуках лепшай долі наймаецца лесніком к пану. Зняважанні, жорсткая эксплаатацыя, поўная эканамічная залежнасць ад капрызаў своенраўных і грубых паноў прымушаюць Міхала ўсё часцей задумвацца аб набыцці свайго ўласнага кутка, сваёй зямелькі.

Шлях, выбраны Міхалам, — няправільны шлях. І ў гэтым увесь трагізм малазямельнага селяніна. Міхал памірае, не ажыццявіўшы сваёй заветнай мары. Але нават калі-б ён застаўся ў жывых, усё роўна не мець-бы яму сваёй зямлі, а тым больш—шчасця і лепшай долі. Не праз імкненне ў адзіночку «прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут», а ў выніку агульнарэвалюцыйнай барацьбы ўсяго сялянства пад кіраўніцтвам пралетарыята ляжала дарога к шчасцю.

Смерць Міхала аб'ектыўна сімвалізіруе сабою крушэнне ўласніцкіх ілюзій. І таму гэта сцэна набывае больш шырокае значэнне.

Міхал — цэнтральны вобраз паэмы. Яго біяграфія — біяграфія многіх дарэвалюцыйных малазямельных сялян, разараемых развіццём капіталізма ў вёсцы.

Недахоп зямлі прымушае яго займацца адхожымі промысламі, біцца, як рыба аб лёд, у пошуках кавалка хлеба.

Цяжка было служыць Міхалу. Калі ён «праз час каторы быў пры падлоўчым на каморы», яму акрамя асноўнай службы прыходзілася працаваць і на сваё начальства.

Міхал яму рабочых ставіў
І сенакосы яго правіў,
І догляд меў за панскім стадкам,
А службу нёс сваім парадкам.

Але нават у гэтага спакойнага,ураўнаважанага чалавека час-ад-часу прарываецца пратэст супроць эксплаатацыі і несправядлівасці:

— Чаго, пан, гэтак раскрычаўся?
Завошта пан мяне так лае?
Згарыць яна няхай такая
І служба гэта, і пасада,
І гэта крыўда, й гэта здрада,
І гэта панская адплата!..
Няхай яна будзе праклята!!!
Міхал тут плюнуў, завярнуўся —
Хоць раз, ды добра агрызнуўся!

Над Міхалам заўсёды вісела пагроза быць перакінутым з аднаго месца ляснціцтва ў другое, пагроза пазбавіцца часова атрыманай зямлі. Колькі працы, колькі сіл уходзіла на тое, каб абжыць закінутую пусташ, зрабіць яе ўраджайнай, і як балюча было пераязджаць па загаду самадура на новае месца і гэтым зноў усё пачынаць спачатку.

Міхал цэпка трымаецца за жыццё. Ён па сваёй натуры аптыміст.

Чым больш прыгнятала панская служба, тым мацней прагне Міхал вызвалення, а гэта вызваленне атоесамліваў ён з набыццём уласнай зямлі.

Усё жыццё хацеў ён «разжыцца ўласнаю зямлёю і не належаць ні да кога, не знаць начальства ніякога».

Адкідаючы ідэю набыцця зямлі, мы цэнім у Міхале цвёрдасць волі, настойлівасць у дасягненні мэты.

... раз ты наважыў дзела,
Ідзі станоўча, роўна, смела,
Ідзі, назад не аглядайся
І на другіх не пакладайся!

У вобразах Міхала і яго брата Антося адлюстраваны асноўныя і лепшыя рысы беларускага сялянства: розум, працавітасць, нянавісць к прыгнятальнікам, чэснасць, здаровы гумар.

Вобраз дзядзькі Антося праходзіць праз усю паэму.

Нароўні з Міхалам дзядзька Антось хварэе за гаспадарку. Між імі і было толькі розніца, што Міхал працаваў у лесе, «Антось-жа правіў гаспадарку», «цягнуў ярэмца хлебароба».

Ён не проста труженік сельскай гаспадаркі, а ўмелы хлебароб, спрактыкаваны знаўца сваёй справы. Паглядзіце, з якім густам выбірае ён у краме касу перад пачаткам касавіцы:

Другі лягчэй знаходзіць жонку,
Свой вечны лёс, сваю красу.
Чым дзядзька добрую касу.

«Лагодны, добры, клапатлівы, на ўсё спагадны і руплівы», ён быў душою сям'і. Не маючы сваіх дзяцей, усю бацькоўскую любоў перанёс ён на дзяцей Міхала. Дзеці плацілі дзядзьку Антосю такой-жа вялікай любоўю. Яны цанілі ў ім прывабнага субяседніка-экскурсавода, арганізатара цікавых забаў і гульняў.

Мы бачым дзядзьку Антося то лукава смяшлівым, то сур'ёзным, але заўсёды аднолькава разумным і жыццёрадасным. І нават няўдачы не асабліва яго засмучаюць:

— Забілі зайца, не забілі,
Але-ж, брат, гуку нарабілі.

Гумар — неад'емная якасць Антося. Дзядзька Антось — паэтычная натура. Ён страсны рыбак, вострa і тонка ўспрымае ўсе з'явы прыроды, яе невянучую прыгожасць і свежасць.

Не малое месца ў паэме адведзена паказу тыповай беларускай сялянкі, жонкі Міхала.

Гэта — не забітая жанчына, а поўная гаспадыня ў доме. З поглядамі гаспадыні лічацца ўсе члены сям'і. Міхал і Антось ва ўсіх важных выпадках абавязкова раяцца з ёю, выслухаюць яе важкае слова.

Ганна — тыповая сялянская гаспадыня, якой «і ручак некалі злажыць» не толькі ў будні, а і ў свята.

Ёй шкада ў ранні час падымаць з цёплай пасцелі сваіх дзяцей, якім «даўно пара ўжо пасвіць стадка».

І не дзіўна, чаму паэт вельмі рэдка называе гэту жанчыну па імені, замяняючы ўласнае імя — словам маці.

Многія лепшыя старонкі «Новай зямлі» прысвечаны паказу дзяцей Міхала. Дзіцячая непасрэднасць, іх забавы, клопаты, жаданні і маленькія хітрыкі настолькі рэальны, што, здаецца, не ў кнізе, а на яве бачыш гэту вясёлую кампанію.

Якой любоўю к дзецям, якім веданнем дзіцячай псіхалогіі прасякнуты раздзелы «Дарэктар», «Начаткі», «Зімой на рэчцы» і многія другія!

Як жывы, устае перад намі «дарэктар», хлопчык Яська «з вузел ростам»,



Засл. дзеяч мастацтваў БССР скульптар **З. Азгур** закончыў работу над скульптурным партрэтам народнай артысткі БССР Л. П. Александроўскай.

Фота І. Каплінскага.

якога ўзялі з вясковай школы і прыставілі вучыць свах равеснікаў.

Разгублены і жалкі, абуты ў новыя лапці, з'явіўся ён перад сваімі вучнямі.

На вечарах гэты «дарэктар» баяўся адзін выходзіць з хаты, а начач «ён у сярэдзіне лажыўся, абы не легчы толькі з краю».

Дзіцячы свет з усёй яго непасрэднасцю глядзіць на нас з «Новай зямлі».

Акрамя сялянскага жыцця, якое з'яўляецца асноўным матэрыялам паэмы, у «Новай зямлі» шырока і праўдзіва паказаны паны і падпанкі.

У сцэне, дзе Міхал капіруе размову лясніча́га з леснікем, як у люстэрку адбіваюцца пагардлівыя адносіны паноў к сялянству:

Хіба не пан?—Міхал падняўся,
Як пан, у бокі важна ўзяўся,
І з панскай мінай пахаджае,
На-польску Пальчыка пытае:
—Цо повеш, галган? Цо потшэба?
Я далам тобе, дурню, хлеба!
Ідзь до д'ябла!—Пан праўдзівы!
—Са смехам Пальчык адзначае...

Так, гэта сапраўды пан! І лексікон яго панскі!

Ляснічыя не лічаць ляснікоў за людзей, называюць іх хамамі, а самі пахамску адносяцца да іх, не ўдастойваючы іх нават адказам на прывітанне.

Напышчаныя лясніччыя аказваюцца бездапаможнымі і нікчэмнымі ў сваім-жа лесе, куды яны прыехалі на паляванне, і вымушаны звярнуцца за дапамогай к леснікам, сапраўдным гаспадарам лесу.

Самадурства, прыдзірлівасць, тунеядства, грубасць — вось тое, што перш за ўсё бачыш, аналізіруючы вобразы паноў.

Раздзел «Дзядзька ў Вільні», сюжэтна звязаны з усёй паэмай, пераносіць чытача ў буржуазна-капіталістычны горад з яго паказным бляскам, бяздушнай канцылярскай халоднасцю, бюракратызмам і хабарніцтвам.

Тут бездакорны фрак, не выслухаўшы мужыка ў сярмязе, не даслухаўшы, чаго ён хоча, не паспагадаўшы яму, буркне: «Опытай аб тым гарадавога».

Тут адзінокім і закінутым сярод чалавечага патоку адчувае сябе селянін.

Быў дзядзька ў пушчах, у барох
І расчытаць іх голас мог,
І з старасвецкімі дубамі
Каротка знаўся, як з сябрамі.
А тут — адзін, бо ўсе чужыя.

Колас — вялікі майстар пейзажа. Яго прырода календарна. Гэта значыць, што калі Колас, напрыклад, апісвае зіму, то гэта зіма не наогул, а зіма пэўнага месяца, пэўнай пары сутак.

Вось як у двух радках дадзен пачатак зімы:

Марозік крэпіць, лёд таўшчэе
І рэчка вольная нямее.

А вось зіма студзеньская, калі:

Адзін мароз адно ўладае,
На ўсё ён рукі накладае,
Усё гне халоднаю нагою;
І лес пад сіняю смугою
Застыў, стаіць, як амярцвелы,
Башлык надзеўшы чысты, белы.

Зусім інакш выглядае зіма на прадвесні, у часе адлігі:

Паміж алешнікаў змяёю
Крыніца чорнай паласою
На свет зірнула,
Лёд прабіла.
У старых карчах загаманіла,
І палыселі касагоры,
Валою поўняцца разоры,
Бяжыць, шуміць вада ў лагчынах.

У раздзеле «Летнім часам» набліжэнне навальніцы над лугам перададзена настолькі праўдзіва, што яе адчуваеш усімі пачуццямі. Тут спалучаецца ў адно цялае і гукавое, і зрокавае, і нават абаняльнае ўспрыняцце, ты адчуваеш, быццам гэтая навальніца праносіцца над табою.

Не ставячы сабе спецыяльнай задачай падрабязны разбор мастацкіх сродкаў «Новай зямлі», застановімся толькі на некаторых прыёмах, у прыватнасці, на коласаўскіх параўнаннях.

Колас любіць параўноўваць з'явы прыроды са з'явамі ў жыцці чалавека.

Галіны перапleценых дрэў асацыіруюцца ў яго з развітаннем маладой пары:

І елка ў пары з хваінoю
Абняўшысь цесна над валою,
Як маладыя ў час кахання
У апошні вечар расставання.

Маладая ліпка між старых вербаў напамінае Коласу рэзвую ўнучку сярод бабулек.

Луговыя прасторы атоесамліваюцца паэтам з тагочаснай смутнай радзімай:

Эх, луг шырокі! Як жывы ты,
Праменнем сонейка заліты,
Стаіш ў мяне перад вачыма,
Ты міл і смуцен, як радзіма
Як наша ціхая старонка,
Дзе смугі сіняя плёнка
У летні час дымком звісае
І даль задумай спавівае.

У лірычных адступленнях, якімі так багата паэма, з вялікай мастацкай сілай выявілася шчырая любоў паэта к свайму народу яшчэ ў тыя далёкія часы, калі ўсе пуцявіны былі зарослы «не чаратом, не лебядою, а беларускаю бядою».

На характар лірычных адступленняў гэтай паэмы аказалі вялікі ўплыў наступныя прычыны: гвалтоўны адрыў Заходняй Беларусі ад БССР, прабыванне паэта ў турме да рэвалюцыі.

Значная частка паэмы напісана Коласам у турме. Разлучаны з роднай прыродай, адгароджаны ад яе паглянай сцяной і жалезнымі кратамі, Колас асабліва тонка ўспрымае хараство і абаяльнасць прыроды. Адсюль і ледзь прыкметны, часта нават не названы сум, навеяны ўспамінамі аб ёй:

Хоць я няволяй цяжка змучан
І з родным берагам разлучан,
Ды я душою ажываю,
Як вокам мыслі адгадаю
Цябе, мой друг, і берег родны...

За тры годы да заканчэння Коласам «Новай зямлі» была гвалтоўна адарвана ад БССР Заходняя Беларусь, месца радзімы паэта. Гэты разрыў даў свой адбітак на заканчэнні паэмы:

Прасторны шлях! Калі-ж, калі
Ты закрасуеш на зямлі
І злучыш нашы ўсе дарогі?

І цяпер, у наш час, асабліва прыемна і радасна адчуваць, што мінулы сум паэта па роднаму краю—толькі гістарычны сведка былога змрочнага жыцця беларускага народа, якое так праўдзіва апісаў у «Новай зямлі» Якуб Колас.

П. ПАПКОЎ

АБ КАРСКІМ

Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай мовы зусім не асвятляецца ў сучаснай навуковай літаратуры, выдаваемай БССР, а, між тым, гэтае пытанне мае велізарнае значэнне для развіцця сучаснай літаратурнай мовы. Больш таго: у нас ігнарыруецца тое, што было напісана раней у гэтай галіне. Так, напрыклад, студэнты, пакідаючы вуз, засвойваюць цвёрда толькі тое, што Карскі быў вялікадзяржаўнікам, што яго працы шкодныя і не маюць ніякай навуковай каштоўнасці. Замест крытычнага засваення культурнай спадчыны яе проста адкідаюць, не задумваючыся над тым, што на сметнік ляціць больш збожжа, чым мякіны.

Карскі заслугоўвае большай увагі, чым ён карыстаўся да гэтага часу. Акадэмік Шахматаў называе яго «заснавальнікам беларускага мовазнаўства і беларускай філалогіі». Сапраўды, у капітальным творы пад агульнай назвай «Беларусы» які з'явіўся вынікам шматгадовай працы, падведзен вынік таму, што было зроблена па вывучэнню беларускай мовы да першых год XX стагоддзя, і дадзен падрабязны аналіз гукаў, форм і сказаў як помнікаў старажытнага беларускага пісьма, так і сучаснай жывой мовы. Яшчэ будучы студэнтам, Карскі ў 1883 годзе выдае зборнік беларускіх песень Н-скага павета Мінскай губерні. У 1885 годзе піша «Агляд гукаў і форм беларускай мовы». Знаёмства з помнікамі старажытнага пісьма, аналіз фальклорнага матэрыялу, сабранага вядомымі фальклярыстамі Шэйнам, Рамановым і інш., удзел у дыялекталагічных экспедыцыях і самастойнае збіранне фальклорных матэрыялаў, вывучэнне беларускай літаратуры—усё гэта паслужыла грунтам да стварэння галоўнага помніка яго жыцця—«Беларусаў» (першы том выйшаў у 1903 годзе, апошні—у 1922 годзе). Першы том прысвечан гісторыі ўтварэння беларускага народа і зараджэння беларускай мовы. Пасля дэтальнага разгляду гісторыі ўсіх плямён, насяляўшых раней тэрыторыю сучаснай Беларусі, і лінгвістычнага аналіза ўсіх помнікаў старажытнасці ён прыходзіць да вываду, што канец XIV стагоддзя можна лічыць за дату афармлення беларускай народнасці і мовы. І хоць пазней беларусы падпадаюць пад моцны польскі ўплыў, яны цалкам захоўваюць асаблівасці сваёй мовы як у галіне фанетыкі, так і ў галіне марфалогіі, сінтаксіса і лексікі. Гэта не голае сцвярджэнне. Яно падмацавана шматлікімі прыкладамі з сучаснай мовы, якія пераконваюць чытача ў справядлівасці вываду аўтара.

Другі том складаецца з трох выпускаў. Ён дае падрабязны гістарычны агляд фанетыкі, марфалогіі і сінтаксіса беларускай мовы. Дэтальнасць аналіза кожнага моўнага факта падмацоўваецца заўсёды вялікай колькасцю прыкладаў з жывой мовы і мовы помнікаў, якімі распалагаў аўтар.

Трэці том, які таксама складаецца з трох выпускаў, дае агляд гісторыі развіцця беларускай літаратуры. Пачынаючы з старажытных помнікаў і фальклору, аўтар у трэцім выпуску трэцяга тома дае крытычны аналіз і сучаснай беларускай літаратуры, даводзячы яго да 1921 года. Шмат у чым нельга згадзіцца з поглядамі аўтара гэтых нарысаў, але нельга адкінуць і раду каштоўных думак. Але гэта патрабуе ўжо спецыяльнага артыкула.

Закончыўшы працу, у прадмове да апошняга выпуску «Беларусаў» Карскі напісаў наступнае: «Развітваючыся з «Беларусамі», аўтар далёкі ад думкі, што паказанымі працамі ўсё вычарпана па мове і літаратуры гэтага племені. Так, па мове яшчэ прадстаіць велізарная задача складання поўнага беларускага слоўніка. Маючыяся слоўнікі Насовіча (1870 год) і Дабравольскага (1914 год) носяць дыялекталагічны характар: яны не ахоплiваюць усёй беларускай вобласці. Акрамя таго, гэтыя слоўнікі не поўныя. Чытаючы слоўнік Насовіча, можна падумаць, што беларусы не ведаюць такіх, напрыклад, агульнавядомых слоў, як «вада», «агонь» і г. д. Такім чынам, складанне поўнага беларускага слоўніка зусім неабходна. Патрэбна зарэгістрыраваць тыя багацці, якімі ўладае беларуская мова». Зусім правільна Карскі паклаў толькі пачатак навуковай распрацоўкі пытання станаўлення і развіцця беларускай мовы, якое ў сучасную эпоху, эпоху росквіту беларускай нацыянальнай культуры, набывае асаблівае значэнне.

У працы Карскага ёсць, безумоўна, рад памылковых палажэнняў, з якімі нельга згадзіцца і якія нельга абыйсці, гаворачы аб дадатных вартасцях кнігі.

Сюды трэба аднесці погляд аўтара на шляхі далейшага развіцця беларускай мовы. Паўтараючы словы прафесара Бодуэна дэ-Куртэнэ, ён пісаў: «Беларуская мова такая блізкая да мовы вялікарускай, што ёй наўрад ці ўдасца ўтрымацца поруч з гэтай апошняй. Для патрэб мастацкай літаратуры і для патрэб навукі беларусы будуць, мусіць, карыстацца і ўперад агульнарускай мовай, вырасшай на вялікарускай глебе».

Гэтыя радкі напісаны былі 18 год таму назад, калі БССР рабіла толькі першыя крокі па шляху самастойнага існавання. Нельга адмаўляць вялікага ўплыву рускай культуры на развіццё нацыянальных культур братніх народаў СССР, тым больш на беларускую, з якой яна мае вельмі шмат агульнага. Але адмаўляць магчымасць развіцця беларускай мовы, як самастойнай мовы, было памылкай. Жыццё абвергла гэту думку Карскага.

Інстытут мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР амаль-што нічога не зрабіў у справе далейшай навуковай распрацоўкі гісторыі беларускай мовы, нічога не зрабіў і ў справе папулярызацыі ўжо зробленага ў гэтай галіне. Грамадскасць павінна прад'явіць рахунак да Акадэміі навук БССР.

А. Кучар

РАМАНТЫКА І АБЫДЗЁННАСЦЬ

„Над Бярозай-ракой“ П. Глебкі ў Дзяржаўным Віцебскім беларускім тэатры

П'еса Пятра Глебкі «Над Бярозай-ракой» — гэта рамантычная эпапея аб суровых днях грамадзянскай вайны. У ёй паказана гераічная абарона Барысава, калі нашы разутыя і галодныя, але прасякнутыя адвагай байцы прымусілі адступіць добра ўзброеныя і значна большыя па колькасці сілы белапалякаў.

Колькі захапляючага ў подвігах гэтых простых людзей рэвалюцыі! Сцэментыраваныя такімі непахіснымі бальшавікамі, як Серго Орджанікідзе, яны ішлі ў бой, ведаючы, што б'юцца за сваю радзіму, за свой народ, за ўласнае шчасце і шчасце сваіх дзяцей.

П'еса «Над Бярозай-ракой» задумана аўтарам як рамантычная рэч. Гэтым і тлумачыцца тое, што яна пісалася вершам, гэтым тлумачыцца і характар бадай усіх персанажаў п'есы.

П'еса «Над Бярозай-ракой» напісана простым і суровым вершам. Многія з маналогаў і песень з'яўляюцца цэльнымі і самастойнымі паэтычнымі творамі. Іменна атмасфера паэтычнасці, рамантыкі, уменне зарадзіць у душы гледача альбо чытача паэтычна празрыстае ўяўленне аб незабыўных днях гераічнай барацьбы, — характарызуюць гэты твор.

П'еса «Над Бярозай-ракой» пазбаўлена складанага сюжэта. Больш таго, сюжэт яе надзвычай агульны. У аснове яго ляжыць драматычна мала канкрэтызіраваны аўтарам факт барацьбы Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам Орджанікідзе за Барысаў. Праўда, ёсць у п'есе праяўленне сапраўднай барацьбы чалавечых страсцей, — гэта перажыванні Азорыча, які вядзе на смерць белапалякаў і сам гіне.

Што датычыць інтрыгі п'есы, дык яна даволі банальная і трымаецца, галоўным чынам, вакол каварстваў, што чыніць польскі шпіён Бесман — фігура, якая за апошнія часы досыць часта паўтараецца ў нашай драматургіі. Прычым, змены, якія перацярпела інтрыга п'есы ў працэсе пастаноўкі, зрабілі гэту фігуру яшчэ менш цікавай. У аўтарскім варыянце Бесман, якога ў контрразведцы ўбачыла Марыч, накіроўваецца да чырвоных, загадваючы контрразведчыкам ні ў якім разе не выпускаць дзяўчыны, бо ад яе залежыць і яго жыццё і справа. На спектаклі-ж атрымліваецца такое ўражанне, што Бесман ідзе да чырвоных пасля таго, як Марыч ужо вызвалена партызанамі. З гэтай прычыны непакой публікі за лёс Марыч у 4-й карціне не з'яўляецца такім вострым, як можна было чакаць.

Наогул, зробленыя тэатрам у п'есе скарачэнні, да пэўнай ступені непазбежныя з прычыны вялікага памеру твора, некалькі абяскровілі паасобныя вобразы. Так, цяпер у спектаклі не знаходзіць лагічнага завяршэння ні вобраз Нічыпара Меляха, ні вобраз Алёшкі, ні нават вобразы Насты і Сёмкі Бягунка.

Аўтар, як пісьменнік, што ўпершыню ўзяўся за напісанне драматычнага твора, дапускае адступленні ў сюжэце, уводзіць карціны не звязаныя з ім. Такой устаўной з'яўляецца, бадай, уся 5-я карціна, напісаная для таго, каб пазнаёміць нас з Серго Орджанікідзе.

Што датычыць вобразаў п'есы, дык некаторыя з іх напісаны абстрактна-рамантычнымі фарбамі. Мова іх не індывідуалізіравана, яны пазбаўлены адменных рыс характару.

Ярчэй за іншых выпісаны Серго Орджанікідзе, Нічыпар Мелях, Алёшка Сямізвон, маці Азорыча, Макарэнка. Рэшта вобразаў—гэта рамантычныя абстракцыі, пазбаўленыя часам нават пэўнай страсці.

Вось перад намі абстрактны, але паэтычна ўзнёслы Азорыч. Праўда, яму ўласціва пэўная страсць. У турме перад смерцю ён марыць аб жыцці, аб шчасці свайго ўбогага, занядбанага краю, аб сваёй маці, аб прыязнай яму прыродзе, якая будзе развітвацца з ім, калі яго павядуць на расстрэл. Потым мы бачым Азорыча тады, калі ён перад намі ў вобразе Івана Сусаніна вядзе белапалякаў на пэўную смерць. Усюды перад намі не канкрэтны вобраз, а абстракцыя рэвалюцыянера, рамантычна ўзнёслага, які глядзіць у будучыню.

Маці Азорыча таксама фігура цалкам рамантычная. У сэрцы яе жыве адно пачуццё — сын. Яго гора і яго пакуты з'яўляюцца сэнсам яе існавання. І жанчына, якая носіць празаічнае імя Наста, з'яўляецца ўвасабленнем непагаснай мацярынскай любові да дзяцей. Гэта Маці з вялікай літары.

У рамантычным плане напісан вобраз Тацяны Марыч. Рамантыкай авеян цудоўны маналог Тацяны ў пачатку I акта, калі пасля адступлення чырвоных яна застаецца адна.

У астатніх карцінах п'есы Марыч вымушана паўтараць агульныя словы, накшталт таго, што «мяне абараняе мой народ», альбо спрачацца з дэманічным, але не менш за Марыч абстрактным Стрыжом у такім стылі: «гэта ён вораг, а не я».

Выканальніца ролі Тацяны М. Белінская робіць усё, каб перамагчы схематызм вобраза. І гэта ёй часткова, асабліва ў першых карцінах, удаецца. Пачынаючы-ж з 5-й карціны, вобраз Тацяны Марыч знікае ў п'есе і ніякія намаганні актрысы не могуць яго ажывіць.

У вобразе Бесмана аўтар дае нам толькі рэзультат, вывад, не паказваючы ўнутраных пружын, якія штурхаюць Бесмана на той альбо іншы ўчынак.

Праўда, трэба аддаць належнае аўтару: аб каварстве Бесмана напісана ў п'есе моцна. Адароны актор заслужаны артыст БССР П. Малчанаў не змог выкарыстаць і таго, што дадзена яму аўтарам. Ён на сцэне не іграе, а працуе. Як аўтар, якому папададна сцэна, Малчанаў адчувае сябе на ёй вольна і не іграе, а ілюстрыруе каварства нейкага бязлікага тыпа, падобнага ні-то на паручыка Яравога, ні-то на Косцю-капітана з п'есы Пагодзіна «Арыстакраты».

Рамантыкай авеяны подвігі байца Макарэнкі, які не выканаў загаду аб адступленні, бо ўбачыў перад сабою прыгожы край, увесь у песнях і садах. І не захацеў аддаць ворагу ні гэтых садоў, ні песень, ні кветак, ні палёў, бо — «усё народнае і наша».

Макарэнка — адзін з самых цэльных і яркіх вобразаў у п'есе «Над Бярозай-ракой».

Рамантыка п'есы «Над Бярозай-ракой» неаддзяліма ад унутранай паэтычнай цельнасці, якой авеян твор. І гэта паўней за усё адчуў пастаноўшчык п'есы В. Аксёнаў. У пастаноўшчыка п'есы ў гэтым выпадку было поўнае ўзаемаразуменне з мастаком В. Кісімавым.

Трэба адзначыць, што афармленне спектакля, пазбаўленае натуралістычных падрабязнасцей, рабіла куды больш лёгкай задачу пастаноўшчыка і акцёраў. Гэта афармленне стварае паэтычную атмасферу. Адчуваецца, што афармленне рабілася не для якой-небудзь п'есы, а іменна для п'есы вершаванай.

У дзесятках дэталей раскрываюць пастаноўшчык, мастак, кампазітар паэзію п'есы Глебкі. Яна раскрываецца і праз цудоўную па сваёй жывапіснасці мізансцэну ў пачатку 4-й карціны, дзе Зяма Штэйнар пагладае з дрэва, ці вяртаюцца партызаны, і ў бліскуча напісанай кампазітарам А. Багатыровым песні, якой партызаны праводзяць Тацяну Марыч да Орджанікідзе. Гэта паэзія адчуваецца ў вельмі падкрэсленай мізансцэне сялян у карціне прыходу белапалякаў, у страшнай па сваёй безнадзейнасці калыханцы, якую спявае Алена свайму дзіцяці ў турме:

Спі, мой хлопчык, ноч малая,
Ходзіць вецер, казкі бае.
На галінцы ў чыстым полі
Ён калыша тваю долю.
Няхай доля не прачнецца.
Горкай слёзкай захлынецца.

Эпізадычная роля Алены добра сыграна артысткай Е. Радзялоўскай.

Але калі паэзія п'есы «Над Бярозай-ракой» даволі добра зразумета і пастаноўшчыкам, і мастаком, і кампазітарам, дык гэтага, як гэта ні дзіўна, нельга сказаць аб рамантыцы, хоць яна непарыўна звязана з паэтычнасцю п'есы. Справа ў тым, што ў пастаноўцы п'еса выглядае больш лірычнай драмай, прасякнутай, праўда, паэтычнымі фарбамі, чым суровай рамантычнай эпапеяй аб днях грамадзянскай вайны. Прычым, пастаноўшчык і мастак імкнуцца трымаць спектакль увесь час калі не на рамантычным, дык па крайняй меры на лірычна-паэтычным узроўні, а большасць выканаўцаў зніжаюць яго да бытавога ўзроўню.

Рэальна-бытавая тэндэнцыя, якая ёсць у пастаноўцы, звязана не толькі з памылкамі рэжысуры, што мала працавала з акторамі ў плане перамагання гэтай тэндэнцыі, але і з хібамі нашых тэатраў наогул, з хібамі самой п'есы «Над Бярозай-ракой».

Справа ў тым, што многія героі п'есы Глебкі аказаліся рамантычнымі героямі без пэўнай моцнай страсці, гэта значыць — рамантычнымі толькі ў словах, у рытарычных зваротах і павярхоўнай узнёсласці. І акторы, імкнучыся запоўніць гэты прабел аўтара, ад рамантыкі кінуліся ў быт, у звычайнае, абыдзённае, каб не стварылася ўражання напышлівасці. Па-другое, рэальна-бытавыя элементы і ў самога аўтара аказаліся даволі моцнымі, і яны штурхалі актораў на шлях бытавізма.

Натуральна, маючы перад сабой п'есу такога характару, як «Над Бярозай-ракой», гэта значыць, па сваёй асноўнай тэндэнцыі — рамантычную, тэатр і павінен быў ставіць яе, як рамантычную эпапею, а не псіхалагічна-бытавую драму.

Калі ў першых чатырох карцінах пастаноўкі адчуваецца паэтычнасць, дык з карціны паяўлення Серго Орджанікідзе ў стылі п'есы пачынаюцца перабоі. З гэтай карціны пачынае пераважаць лінія рэальна-бытавая. У гэтым плане часткова і напісан аўтарам Серго Орджанікідзе — асноўны вобраз п'есы «Над Бярозай-ракой».

Трэба адзначыць, што Пятро Глебка праявіў сапраўдную смеласць у паказе гэтага выдатнага чалавека нашай краіны і партыі. Глебка, здаецца, першы ў нашай драматургіі адмовіўся ад паказу вобраза правадыра ў абставінах і ўчынках, дакументальна засведчаных. Ён паказвае не толькі сапраўды адбыўшыяся ўчынкі Серго, але і тыя, якія маглі здарыцца. І гэта абсалютна правільны падыход да такой адказнай тэмы, як паказ вобраза кіраўніка рэвалюцыйнай барацьбы.

У Глебкі вобраз Серго Орджанікідзе напісан даволі поўна і ўсебакова. Паказана ўменне Серго пранікнуць у самае сэрца салдата рэвалюцыі, яго чуласць, клапатлівасць у дачыненні да людзей, яго нянавісць да ўсялякай недысцыплініраванасці і разбэшчанасці. Але іменна тут п'еса з рамантычнай ператвараецца ў рэальна-бытавую. З 5-й карціны, калі на сцэне выступаюць такія персанажы, як Алёшка Сямізвон, Нічыпар Мелях, спектакль набывае зусім іншы характар, іншы каларыт — пераважна рэальна-бытавы. Рамантызм п'есы адыходзіць на задні план. І тут пэўным чынам сказалася традыцыя, якая паспела ў нас ужо скласціся, калі аўтар імкнецца, што называецца, «ацяпліць» вобраз.

Выдатна сыграная народным артыстам БССР А. Ільінскім роля салдата Меляха выглядае роляю не з гэтага спектакля. Публіку незвычайна цешыць тое, што Мелях раней, чым пачаць есці спрабуе перахрысціцца і, заўважыўшы погляд Орджанікідзе, паспешна замінае гэты жэст. Гледача таксама пацяшае тое, як у часе яды Ільінскі старанна выцірае лыжку аб крысо альбо выкідвае з капялюша смецце. Але ўсё гэта дэталі з рэальна-бытавой п'есы, а не рамантычнай. Іменна тут і ў Серго, і ў Меляха і ў Алёшкі пачынаецца ігра ў рэальна-бытавым плане з выкарыстаннем бытавых дэталей.

Праўда, аўтар п'есы, для якога рамантычна-гераічны стыль больш блізкі, чым рэальна-бытавы, вельмі хутка зноў вяртаецца да рамантычнага пафасу. Паяўляецца Макарэнка, які апавядае Серго аб тым, што не выканаў загаду аб адступленні, што «сэрца падвяло». Яркі вобраз байца-рамантыка, кожнай часцінкай сваёй душы звязанага з жыццём, з прыродай, стварае актор А. Трус. Серго пачынае збірацца ў разведку, і тут мы зноў апынуліся ў атмасферы рамантыкі і паэзіі.

І пастаноўшчык, і мастак чым-ні-чым імкнуцца дапамагчы стварэнню гэтай паэтычнай атмасферы,—недзе за сцяною шуміць дождж, усхліпвае гармонік, міма вакзальнага пакоя, у якім адбываецца дзея, імчацца цягнікі, што вязуць байцоў на фронт. Цудоўная дэталь: у пакой далятае абрывак песні з цягніка, які праносіцца міма. Але ўсё гэта не можа выратаваць становішча. Акторы іграюць пераважна ў спакойна-бытавым плане.

І гэта ў першую чаргу адносіцца да выканаўца ролі Серго Орджанікідзе заслужанага артыста БССР Н. Звездачотава. Трэба проста сказаць, што ролі Орджанікідзе пакуль-што не зроблена. Звездачотаў знадворна мала падобны на Серго. Але не ў гэтым, зразумела, бяда. У Звездачотава добра знойдзены асобныя дэталі вобліка Орджанікідзе, жэсты, манеры звяртацца да субяседніка. У адным месцы, калі Серго наступае да Бесмана: чаму ён расхлістаны, чуецца нават спецыфічна орджанікідзеўскія інтанацыі ў голасе. Але ўсё гэта не можа кампенсіраваць адсутнасці галоўнага—пафасу Серго Орджанікідзе і разумення таго, што іграецца рамантычная п'еса.

Зразумела, пафас не абавязкова павінен выражацца ў павышаных інтанацыях, ён можа быць увасоблен і ў інтанацыях, пабудаваных на шэпце, але ў гэтым шэпце павінна адчувацца сіла пачуцця, душа актора. Глебка нямала папрацаваў над тым, каб улавіць рытм мовы Серго, спецыфічнасць яго зваротаў. І гэта яму ў многім удалося. Аднак-жа, у Звездачотава гэты спецыфічны рытм мовы Серго не адчуваецца.

Ключ да разумення Серго Орджанікідзе ляжыць у тых словах, якія Палітбюро ЦК ВКП(б) пісала ў дзень смерці Серго: «Палымяная энергія, настойлівасць і прамата... спалучаліся ў ім з цудоўнымі якасцямі той сардэчнасці і таварыскай прастаты ў адносінах да людзей, якія так добра вядомы ўсім, асабліва ведаўшым тав. Серго». Гэта азначае выключна ясны, цвярозы розум і палымнеючае пачуццё любві да народа і нянавісці да ворагаў. Гэта пафас пачуцця, які выражаецца не ў крыку і гучных інтанацыях, а ў пераходах ад самых ласкавых і інтымных тонаў да бурных і імклівых. Якраз усяго гэтага ў выкананні Звездачотава яшчэ няма.

Тое, што рамантычны пафас можа быць выражан не абавязкова ў крыку і гучных інтанацыях, ярчэй за ўсё паказаў заслужаны артыст БССР Ц. Сяргейчык, які выконвае ролю Азорыча. Ён пабудаваў сваю даволі бясцветна напісаную аўтарам ролю на ціхіх, — можа залішне ціхіх,—інтанацыях. Але ў яго выкананні адчуваецца ўнутраная сканцэнтраванасць, унутраная сіла. Ён выражае і бязмежную волю да жыцця, і непахісную ўпэўненасць у сваёй справе, і бясстрашнасць. Азорыч і жыць хоча, але і смерці не баіцца. Як бурна радуецца ён з той прычыны, што яму ўдалося перадаць весткі на волю! У прадсмяротнай карціне позірк яго настолькі пранікліва, што ён глядзіць, здаецца, у бяссмерце. І калі-б інтанацыям Сяргейчыка больш празрыстасці, яснасці, гэты вобраз можна было-б лічыць адным з самых моцных у спектаклі.

Трэба спыніцца на адной з самых рамантычных сцэн у п'есе Глебкі—на сцэне, у якой Серго паказваецца ў разведцы. У гэтай карціне адбываюцца драматычна найбольш патрасаючыя падзеі. Паміраe Азорыч. Маці рыдае над яго трупам. Над магілай Азорыча Серго гаворыць поўную вялікага пачуцця прамову.

Здавалася-б, што тут, сярод стогадовай пушчы, бачачы такое вялікае чалавечае гора, Серго, які заставаўся знадворна спакойным у самыя цяжкія хвіліны жыцця, павінен выявіцца ва ўсёй сваёй сіле, а ў Звездачотава нават такія цудоўныя, поўныя рамантычныя радкі, як «над ім не іграюць ні трубы, ні сурмы, а вецер спявае, гамоняць маланкі», чытаюцца абыдзённа і бясстрасна.

Гэта абыдзённасць і пераводжанне п'есы з рамантычнага ў бытавы план яшчэ больш адчуваецца ў выканальніцы ролі маці Е. Лагоўскай. Наста—маці Азорыча —нясе ў сабе вялікія пакуты і вялікую мужнасць, а ў Лагоўскай гэта звычайная, крыху прымхлівая старая сялянка, якая галосіць і прычытае над сынам. Яшчэ і цяпер у маіх вушах гучыць страшная сваёй абыдзённасцю фраза, пачутая на спектаклі з вуснаў Лагоўскай: «Сімха? Бачыш, Сімха, якое гора!».

Пятро Глебка ў сваёй п'есе, робячы нават уступкі быту, абыдзённасці, утрымліваецца, аднак, на рамантычным узроўні. Ярчэй за ўсё гэта характарызуе вобраз Нічыпара Меляха. Аказваецца, у п'есе Мелях—не толькі быт, не толькі служака, смешны сваёй сялянскай разважлівасцю і прасталінейнасцю,—у п'есе ёсць у Меляха свая тэма. Ён, гэты служака, гаворыць такія незвычайна паэтычныя і суровыя словы:

Ліхаманкай гараць нашы твары,
Калі ты нам у вочы глядзіш.
Лепш вядзі нас, злачынных, таварыш,
У агонь, у магілу, пад крыж.
Хоць куды! Абы змыць гэты сорам,
Ці загінуць у бойцы не ў час,
Каб ні людзі, ні сонца, ні зоры
Не глядзелі з дакорам на нас.

Завяршэнне гэтай глыбока рамантычнай тэмы Меляха мы знаходзім у 9-й карціне, якая засталася па-за спектаклем. Натуральна, раз гэта тэма не знаходзіць сабе завяршэння ў спектаклі, Ільінскі і спрабуе іграць Меляха, як забітага чалавека, здобрываючы ўсё гэта акторскімі смешнымі штукамі.

Ігра А. Ільінскага падабаецца публіцы. Наогул глядач, які ў спектаклі часцей бачыць не рамантыку, а бытавую драму, патрабуе гумару. Вось чаму ён так добра ўспрымае Алёшку Сямізвона, таксама цікава сыгранага ў бытавым плане акторам П. Івановым, і нават Сёмку Бягунка. Дарэчы, жарты Сёмкі ячна не смешныя. Актору І. Тупіку гэта роля не ўдалася. Асабліва меладраматычна гучыць раскаянне Бягунка ў карціне, калі ён кідае грошы жабракам. Справа ў тым, што і Бягунок быў задуман аўтарам у плане незвычайным. Ён таксама паэтычная натура, далёкая ад звычайных сялянскіх дзядоў-жартаўнікоў. І гэтага тэатр таксама не зразумеў.

З іншых выканаўцаў роляў у гэтым спектаклі дадатна трэба адзначыць актораў А. Шалега, Л. Кастрыцу, Н. Вальчыка і асабліва А. Маўзона,—запамінаецца яго жэст, што выражае безнадзейнасць у карціне, калі белапалякі забіраюць у яго тавар, не плоцячы грошай. У плане рэжысёрскай работы апошнія карціны зроблены значна слабей за першыя, асабліва дрэннае ўражанне пакідае вельмі мітуслівая заключная карціна. Гэта адчуваецца і ў афармленні. Афармленне 7-й карціны залішне грамоздкае і перашкаджаючае дзеі, а паказаная ў 7-й карціне Бярозарака выглядае залішне бутафорскай.

Такім чынам, з сказанага вышэй можна зрабіць гэткі вывад: рамантычная п'еса мае свае адрозныя ад п'есы псіхалагічнай і бытавой законы. І яе трэба ставіць і іграць, як п'есу рамантычную.

УЗНАГАРОДА, ЗДАБЫТАЯ Ў БАЮ

У марозны снежаньскі дзень Н-ская часць прыбыла на фронт. Разам з ёю прыбыла і рэдакцыя газеты «Большевик». Пасля таго, як часць заняла пэўны рубеж, работнікі рэдакцыі абсталяваліся ў густым ляску на беразе возера. Увечары, адразу пасля прыбыцця, рэдактар газеты тав. Рубінштэйн выехаў у часць. А раніцай выйшаў першы нумар газеты «Большевик». На першай паласе быў аншлаг: «З імем Сталіна на поўны разгром і знішчэнне ворага».



І. Рубінштэйн.

Пачалася штодзённая крапатлівая работа.

Перасоўвалася часць, а разам з ёй і рэдакцыя газеты. Свой матэрыял тав. Рубінштэйн, як і другія работнікі рэдакцыі, пісаў і ў лесе, седзячы на пні, і ў зямлянцы, і ў кабінцы аўтамашыны. Пісаў і пры электрычным святле, і пры святле агарка свечкі альбо капцілкі.

Асабліва праславілася Н-ская часць. І вось раніцай тав. Рубінштэйн разам са сваім памочнікам тав. Ольховік на лыжах адправіліся ў гэту часць. У кожнага з іх за спіной вінтоўка, за пазухай наган, на поясе гранаты, у кожнага проціваз, маскіровачны халат.

Заначаваць прыйшлося на пазіцыі ў зямлянцы. Спалі пад артылерыйскую кананаду. Адна з бліжэйшых зямлянак была начыста знішчана артылерыйскім снарадам. Раніцай т.т. Рубінштэйн і Ольховік прыйшлі ў рэдакцыю і далі паласу аб поспехах часці.

У газеце быў спецыяльны аддзел «Франтавыя жарты». Вось адзін з такіх «жартаў», апублікаваных у газеце на тэму аб белафінскіх снайперах, якія стралялі з дрэваў:

«Якая розніца паміж зязюляй звычайнай і фінскай «зязюляй»? Агульнае ў іх тое, што абедзве сядзяць на дрэве і любяць забірацца ў чужыя гнёзды. Але звычайная зязюля, калі пугнеш з ружжа, узлятае ўверх, а «зязюля» белафінская, як правіла, ад нашай снайперскай вінтоўкі ляціць уніз».

Байцам таксама спадабаўся і аддзел «Рускія класікі аб белафінскіх і іншых справах» і «Новыя «устаўныя» правілы белафінаў» і г. д., гумарэскі, частушкі аб слаўнай пяхоце і г. д.

Газета жыва адгукалася на ўсе падзеі жыцця часці, шпарка падхоплівала тое новае, што нараджалася ў падраздзяленнях часці, шырока папулярызіравала вопыт перадавікоў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць рэдактар газеты — старшы палітрук Іосіф Маркавіч Рубінштэйн быў узнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды.

К. ПЯТРОЎ.

НА БАЯВЫМ ПАСТУ

Насценгазеты Тэатра оперы і балета БССР.

У падрыхтоўцы Тэатра оперы і балета БССР да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве яго насценныя газеты займаюць значнае месца. Адны назвы газет: «За совецкую хорэаграфію», «За совецкую оперу» «На варце» і іншыя сведчаць аб іх напрамку, мэтаімкнёнасці. І сапраўды, увесь змест газет, пачынаючы з творчых пытанняў і канчаючы тэхнічнымі непаладкамі, падпарадкаван адной ідэі—стварэнню спектакляў, вартых паказу на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

Першае месца сярод насценнага друку тэатра бяспрэчна займае насценная газета балетнага цэха «За совецкую хорэаграфію». Гэта сапраўды баявы орган грамадскасці балетнага цэха. Кожны нумар газеты вельмі змястоўны, насычан канкрэтнымі фактамі, прыгожа і ярка афармлен. У кожным радку, у кожным штрыху адчуваецца велізарная любоў рэдкалегіі (Дароніна, Хіраска, Габаева і Сушчынскай) да сваёй насценгазеты.

У кожным нумары можна спаткаць артыкул саліста балета аб творчай рабоце над вобразам, крытычны артыкул аб той ці іншай пастаноўцы, рад заметак аб ненармальных з'явішчах у цэху. Артыкул салісткі балета заслужанай артысткі БССР тав. Нікалаевай аб яе рабоце над вобразам Зоські ў балеце «Салавей», артыкул таленавітага саліста балета тав. Дрэчына «Работа над вобразам», крытычны артыкул балетмейстара тав. Ппіно аб недахопах пастаноўкі «Кветка шчасця», змешчаны ў парадку абгаварэння, і іншыя выклікаюць вялікую цікавасць і служаць вельмі павучальным матэрыялам для ўсяго калектыва балетнага цэха, асабліва-ж для моладзі.

З нумара ў нумар друкуюцца ў насценнай газеце вершавыя фельетоны Габаева, Бабаніна-Ордынскага, дасціпныя эпіграмы, сяброўскія шаржы.

Насценная газета цэха салістаў «За совецкую оперу» выходзіць менш рэгулярна, не так ярка афармляецца, але і ў ёй шмат цікавага, злобадзённага, каштоўнага матэрыялу. Газета аддае шмат увагі сацыялістычнаму спаборніцтву сярод салістаў, узнімае рад творчых пытанняў.

Насценгазета «Голас хора» правільна ўзнімала пытанні ўмацавання працоўнай дысцыпліны. Добра зрабіла газета, калі падрабязна асвятліла вельмі цікавае выступленне (на адной з рэпетыцый хора) прафесара Галаванава, яго каштоўныя ўказанні наконт дакладнай інтанацыі, выразнай і яснай дыкцыі, строгага рытму.

Некалькі горш па зместу і афармленню насценгазеты аркестровага цэха, мімічнага ансамбля, пажарнай аховы.

Нажаль, не ўсе яшчэ цэхі тэатра маюць насценныя газеты. Гэты прабел заклікана ліквідзіраваць агульнатэатральная насценгазета «Жыццё тэатра», якая пачала выходзіць нядаўна. Вопыту ў яе яшчэ нямнога, але, мяркуючы па першых двух нумарах, газета абяцае быць таксама вельмі змястоўнай і цікавай.

Няма ніякага сумнення, што ўвага, якой карыстаюцца насценгазеты ў Тэатры оперы і балета, ёсць вярнейшая гарантыя далейшага росквіту насценнага друку ў тэатры.

І. ПРАЎДЗІН.

НАШ ЛЕПШЫ ДЫРЫЖОР

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Марк Эмануілавіч Шнейдэрман нарадзіўся ў 1898 годзе. Па сканчэнні Ленінградскай кансерваторыі ў 1930 годзе (па дырыжорскаму класу ў праф. Малько, па тэорыі—у М. О. Штэйнберга, па аркестроўцы—у нябожчыка кампазітара А. К. Глазунова) працаваў штатным дырыжорам Ленінградскай філармоніі. Яшчэ ў часе вучобы ў кансерваторыі, у 1927—29 годзе, М. Э. Шнейдэрман дырыжыраваў у Оперным тэатры, пры кансерваторыі і на радыё. У 1930—31 годзе ён сумяшчаў работу ў Ленінградскай філармоніі з работай у Оперным тэатры імя Неміровіча-Данчэнка ў Маскве, дзе вёў рад спектакляў.

У 1935 годзе тав. Шнейдэрман пераехаў на сталую работу ў БССР, дзе заняў месца дырыжора ў Оперным тэатры.

За час сваёй амаль 15-гадовай дырыжорскай практыкі М. Э. Шнейдэрман правёў да сарака розных опер. Але асабліва шырока разгарнулася яго дырыжорская дзейнасць у БССР пры рабоце над першымі беларускімі операмі—«Кветка шчасця» Туранкова і «Міхась Падгорны» Цікоцкага. Работа гэта з'яўляецца ўзорам творчага супрацоўніцтва дырыжора з кампазітарамі. За апошні час М. Э. Шнейдэрман з поспехам праводзіць і балетныя спектаклі: «Лебядзінае возера» Чайкоўскага і першы беларускі балет «Салавей» Крошнера.

Як сімфанічны дырыжор, М. Э. Шнейдэрман за час сваёй работы ў Ленінградскай філармоніі прадырыжыраваў вялікую колькасць твораў: усе сімфоніі Чайкоўскага, сімфоніі Бетховена, Моцарта, Брамса, творы Рымскага-Корсакава («Шэхеразада» і інш.) Мусаргскага, Бізэ і іншых.

І ў галіне сімфанічнай музыкі М. Э. Шнейдэрман шмат і плённа працуе над творамі совецкіх (галоўным чынам, ленінградскіх) кампазітараў: Шастаковіча, Шаперына, Попова, Кніпера, Палавінкіна, Гнесіна, Кабалеўскага, Мяскоўскага, Глазоўскага, Дзяржынскага і інш.

Характэрныя рысы дырыжорскага таленту тав. Шнейдэрмана: вялікі тэмперамент, добры густ, уменне валодаць аркестровым калектывам, чоткі і зразумелы ўзмах, выдатнае чытанне партытуры. Усё гэта вылучае яго ў рады лепшых нашых дырыжораў.

Е. ЦІКОЦКІ.



Новая група заслужаных работнікаў музыкальна-вакальнага мастацтва БССР. Злева направа: заслужаны артыст рэспублікі А. Арсенка, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі М. Шнейдэрман, заслужаны артыст рэспублікі В. Лапін, заслужаны артыст рэспублікі П. Засецкі.

Фота І. Каплінскага.

ВЫДАТНЫЯ САЛІСТЫ

З пачуццём глыбокага задавалення сустрэў калектыў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР указ Вярхоўнага Савета БССР аб прысваенні звання заслужанага артыста БССР салістам В. Лапіну, П. Засецкаму, А. Арсенка.

Заслужаны артыст БССР В. Лапін — першакласны вакаліст, які валодае прыгожага тэмбру лірыка-драматычным тэнарам. Ён стварыў рад яркіх вобразаў.

Возьмем вобраз Андрэя з оперы А. Багатырова «У пушчах Палесся». В. Лапін у гэтай ролі строга канспірацыйны пры сустрэчы з бальшавіком-падпольшчыкам Кузьмічом, абаяльна рамантычны ў сустрэчы з каханай Аўгіннай. У сцэне-ж допыту белапалякаў Андрэй—Лапін едка саркастычны, адным толькі выглядам сваім выклікае шалёную злосць ворага. Увесь вобраз простага вясковага хлапца, вырастаючага ў героя, які аддаў сваё жыццё за справу вызвалення народа ад прыгнёту эксплаататараў, В. Лапіным зроблен па-майстэрску і шчыра. Выразны створаныя В. Лапіным вобразы Міхася ў оперы Цікоцкага «Міхась Падгорны», Князя ў оперы А. Даргамыжскага «Русалка», Кандрата ў оперы А. Туранкова «Кветка шчасця.»

Заслужаны артыст рэспублікі П. Засецкі—выдатны артыст вялікай унутранай сілы і невычарпальнага багацця фарбаў. Вобраз Саўкі ў оперы «У пушчах Палесся» зроблен П. Засецкім надзвычай праўдзіва. Саўка прыкоўвае да сябе ўвагу гледача з пачатку і да канца спектакля, прымушаючы яго хвалявацца і перажываць усе моманты яго жыцця. А гэта сведчыць аб вялікай акторскай адоронасці Засецкага, валодаючага шчаслівым спалучэннем абаяльнага, выразнага і багатага цэлай гамай мімічных нюансаў твару і прыемным голасам — меццо-характарным тэнарам.

У ролі Мікіты ў оперы «Кветка шчасця» Засецкі выяўляе велізарнае багацце камедыйных фарбаў і гумару, поўнага народнай дасціпнасці і свежасці. Нават у невялікай ролі Мерціна ў оперы «Міхась Падгорны» Засецкі ўмее быць у цэнтры ўвагі.

Заслужаны артыст рэспублікі А. Арсенка выключна музыкальны вакаліст, які валодае свежым, гучным лірычным барытонам. Звычайна ролі лірычных барытонаў, дзякуючы асаблівасцям гэтага голаса, не насычаны драматычнымі ці трагічнымі элементамі, а будуюцца ў плане рамантычных ці ўзвышана-эпічных настрояў.

Але ўсё-ж Арсенку, дзякуючы яго вялікаму артыстычнаму тэмпераменту, удаецца з вялікай унутранай сілай і пераканаўчасцю данесці да гледача ролю Кузьміча ў оперы «У пушчах Палесся» і зусім супрацьлеглую па вобразу і вакалу ролю польскага афіцэра Вітольда. Такое закончанае пераўвасабленне з вобраза ў вобраз, супрацьлеглы адзін другому, сведчыць аб вялікай культуры і майстэрстве артыста. У ролі Андрэя ў оперы «Кветка шчасця» Арсенка дае закончаны вобраз перадавога селяніна таго часу, не схіляючага галавы перад панскімі ўладарамі і аказваючага ўплыў на сялянскую масу, узнімаючы яе на ўзровень усведамлення сваёй чалавечай годнасці і гордасці.

Падводзячы вынікі кароткага аналізу творчасці гэтых салістаў, нельга не адзначыць, што такі шпаркі і эфектыўны росквіт мастацтва і яго таленавітых прадстаўнікоў магчым толькі ў нашай шчаслівай краіне сацыялізма.

Н. Б. ГРУБІН.

Галоўны дырыжор Тэатра оперы і балета БССР.

„СЕРВІС“

Урывак з эксцэнтрычнай кінокамедыі

Л. КАЦОВІЧ

Прыёмная Ліпатава. Многа людзей.

Ігар і Алёшка, спацелыя, прабіраюцца да дзвярэй кабінета. Іх не прапускаюць людзі, якія стаўпіліся ля дзвярэй.

У Алёшкі зарадзілася мысль. Ён падміргнуў Ігару і абодва выйшлі ў калідор.

Праз мінуту абодва вярнуліся, і мы бачым бягучага наперадзе ўзбуджанага Алёшку і нязграбна шагаючага за ім Ігара з узнятым жаўнярам і партфелем пад пахай.

— Грамадзяне! — крыкнуў Алёшка,— чаго стаўпіліся?... Дайце галоўнаму прайсці!.. Прашу вас, таварыш начальнік!.. — звярнуўся ён да Ігара.

Людзі расступіліся. Ігар увайшоў у кабінет і Алёшка хацеў шмыгнуць за ім. Яго затрымалі.

— А вы куды?

— Я яго асабісты сакратар...

Кабінет. Ліпатаў гаворыць па тэлефону. Скончыўшы размову, ён паглядзеў на Ігара і Алёшку і ветліва ўсміхнуўся ім.

— Прашу!..

Ігар і Алёшка зірнулі адзін на другога і радасныя селі.

— Так, так... — сказаў Ліпатаў і зноў усміхнуўся.

Затым ён паглядзеў на гадзіннік і нахмурыў бровы.

— Спазніліся! — здзіўлена сказаў ён. — спазніліся, таварышы!.. Я з вамі дамаўляўся на якую гадзіну?..

— На дзве гадзіны... — нясмела адказаў Ігар.

— Дакладна на дзве гадзіны... — паўтарыў Ліпатаў, а цяпер... — ён працягнуў руку з гадзіннікам, — цяпер, бачыце, дванаццаць мінут трэцяй.

Запанавала глыбокае маўчанне.

Сумна апусціўшы галовы, Ігар і Алёшка выходзяць з установы, у якой яны правялі зараз некалькі горкіх мінут.

Ім насустрач спяшаецца Майсей Файн.

— Куды вы, таварыш Файн?—крыкнуць Алёшка.

— На вучобу! — весела адказвае Файн, — знаёмлюся з матацыклам!.. Не маё імя Майсей, калі гэта не цуда! Падумайце, я снабжэнец Бел. снаб. быт. ганд. прома, маю для свайго асабістага карыстання матацыклет!.. Прыма прымуцімус!.. (Заўважае гальштук у Ігара). Дазвольце, Ігар, гэты гальштук, калі я не памыляюся, дзвюхшоўк фабрыкі «Красное знамя»... адгадаў? Вось бачыце, які я вучоны! Усё ведаю... Што вы так сумна глядзіце на мяне?.. Якая муха вас укусіла?

— Нічога... — уздыхнуў Ігар і рэзка адпіхнуў ад сябе каменьчык, — нічога, чорт падзяры...

— Не палохайце мяне, у імя бога!— палахліва паглядзеў на яго Майсей Файн, — скажыце, што здарылася?..

— Майсей Якаўлевіч, — сказаў Алёшка, — вы нам усё роўна нічым не зможаце дапамагчы...

— Я? — здзівіўся Файн, — выбачайце... але вы яшчэ не ведаеце Файна!..

Ігар і Алёшка пераглянуліся.

— Ну, гаварыце, гаварыце... — падбадзёрваў іх Файн.

— Мы задумалі цікавую справу, — пачаў Ігар, — мы вырашылі ў нашым горадзе пабудаваць...

Ён махнуў рукой і дадаў:

— Баюся, што нічога не выйдзе...

— Ну, вось, — рассмяяўся Файн, — яшчэ не пачалі будаваць, а ўжо сумняваецеся... Што вам уздумалася пабудаваць?.. Лазню?..

— Не, — сказаў збянтэжана Алёшка, — камбінат...

— Лазня-пральны камбінат?

— Не, — ціха сказаў Ігар, — камбінат бытавога абслугоўвання...

Файн з палёгкай уздыхнуў:

— Няхай мяне не завуць Майсей Файн, калі гэта не сучасная ідэя!.. Добра! Цяпер скажыце, што вам трэба, па-першае?

— Па-першае, — сказаў Алёшка, — нам патрэбна зацікаўленая ўстанова...

— Дванаццаць такіх устаноў вам хопіць?

— Нам хопіць адной...

— Тым лепш, — у такім-жа сур'ёзным тоне сказаў ён, — а што вам, па-другое?

— Па-другое, нам патрэбны грошы для гэтай справы...

— Гэта лягчэй за ўсё... — сказаў Файн.

Ігар і Алёшка здзіўлена зірнулі на яго.

— Грошы будуць! — упэўнена паўтарыў Файн, — што яшчэ?..

— Але падумайце, колькі грошай, Майсей Якаўлевіч, дзе вы іх возьмеце?— сумняваецца Ігар.

Файн дакорліва паківаў галавой.

— Божа мой, людзі жывуць побач і не ведаюць свайго суседа!.. Хіба было штонебудзь такое, каб Файн не мог дастаць?.. На небе гаспадар бог, на зямлі — я гаспадар!.. Калі вы думаеце будаваць? І колькі грошай вам спатрэбіцца?.. Напішыце на паперы, падпішыцеся і ўсё будзе ў парадку... Не я буду Майсей Файн, калі я вам гэтага не зраблю! Бывайце, паспяшаюся на матагурток...

І, развітаўшыся, ён шпарка адыходзіць.

Ігар і Алёшка, падміргнуўшы адзін другому, паціскаюць плячамі і ў душы смяюцца пад гэтым заўсёды аптымістычна настроеным, самаўпэўненым чалавекам.

***

Гадзіннік б'е два разы.

Ігар і Алёшка сядзяць у кабінеце Ліпатава.

— Вось бачыце, — гаворыць Ліпатаў, — людзей трэба прывучаць да акуратнасці...

Ігар і Алёшка вымушана ўсміхнуліся.

— Ну-с, чым я вам магу служыць?— сказаў Ліпатаў, усеўшыся шчыльней у крэсла.

Сябры ажывіліся. Перапыняючы адзін другога, усхвалявана пачалі гаварыць:

Ігар. Мы хацелі вас прасіць...

Алёшка. У нас такая справа, таварыш Ліпатаў, — справа такога роду...

Ігар. Калі вам расказаць з самага пачатку, як гэта ўзнікла...

Алёшка. Аб гэтым я мог-бы вам расказаць у двух словах...

Ліпатаў (паціскаючы плячамі). З усяго сказанага вамі я суміроўваю і раблю вывад, што вы нічога не сказалі...

Ігар. Правільна, правільна! Дазвольце мне! Алёшка, не перапыняй! Я раскажу вам так, каб вы сабе ўявілі наглядна...

Алёшка. Безумоўна, калі...

Ігар (грозна). Алёшка!..

Алёшка. Маўчу...

Ігар. Дык вось!.. Уявіце сабе...

НАПЛЫЎ. Працяглы гудок паравоза. Поезд падыходзіць да перона.

Голас за кадрам. Вы прыязджаеце ў горад...

З вагонаў выходзяць людзі, запыленыя, аброслыя, змятыя. Сярод іх вылучаецца Ліпатаў.

Голас за кадрам. Вас сустракаюць...

Ліпатаў здымае чамаданы і тут-жа яго сустракае жонка з дзецьмі. Яго акружаюць. Ён абтрасае з сябе пыл, праводзіць рукой па шчоках і сам жахаецца свайго выгляду, яму няёмка.

Голас за кадрам. Але вось вы, запылены, аброслы, у падраных чаравіках, у змятым касцюме, трапляеце ў наш камбінат...

Красачна прыгожы ўваход і надпіс, які свеціцца:

ДАБРО ПАЖАЛАВАЦЬ!

Ліпатава сустракаюць ля ўваходу Ігар і Алёшка. Яны апрануты ў якуюсьці фантастычную форму, абдымаюць Ліпатава і вядуць яго ў камбінат.

Хтосьці, тым часам, забірае яго чамаданы на хаванне. Хтосьці адводзіць жонку ў фантастычную залу чакання, а дзяцей у неапісваемы дзіцячы пакой.

Голас за кадрам. І ўсё да вашых паслуг!..

Даносіцца пранізлівы свіст. Віхрам расчыняюцца дзверы. (Музыка).

Ліпатаў брыецца. (Рэзкая музыка).

Ліпатаў пад душам... (Нарастаючая музыка).

У кравецкай майстэрні прасуюць яго штаны... (Напружаная музыка).

У штопальнай — штопаюць шкарпэткі... (Вясёлая музыка).

У гадзіннікавай майстэрні прачышчаюць яго гадзіннік... (Лірычная музыка).

Апрануты ў чысты і выгладжаны касцюм, у бліскучым крухмальным каўнерыку, Ліпатаў здымаецца ў фатографа. (Урачыстая музыка).

Ліпатаў паяўляецца ў зале чакання.

Жонка яго спачатку не пазнае, потым, пляснуўшы рукамі, ускліквае:

— Коля! Гэта ты?..

Ён уваходзіць з жонкай у дзіцячы пакой. Дзеці пураюцца яго. Жонка, туляючыся да яго, гаворыць:

— Дзеці, гэта-ж ваш тата!..

Дзеці, пляснуўшы рукамі, ускліваюць хорам:

— Татка, няўжо гэта ты?..

Ліпатаў рассмяяўся, закрыўшы далонню твар.

З НАПЛЫВУ. Ліпатаў у сваім кабінеце, адкінуўшыся на спінку крэсла, смяецца, прыкрыўшы твар далонню.

Ігар і Алёшка ўспацелыя стаяць з абодвух бакоў і чакаюць яго рашаючага слова.

Пауза. Ліпатаў становіцца сур'ёзным. Узняўшы галаву, пазірае на Ігара і Алёшку і абыякавым тонам пытаецца:

— Ну-с, дык у чым-жа справа?..

Ігар. Мы просім выдзеліць адпаведнае памяшканне і патрэбнае абсталяванне...

Алёшка. І неабходныя сродкі...

Ліпатаў. Ах, вось вы аб чым... — ён міла ўсміхаецца, — памяшканне, абсталяванне і сродкі?.. Лоўка, лоўка, малайцы... (Ён зноў усміхаецца). Толькі, ведаеце, чэснае слова, тут некаторая няяснасць... Якое, уласна кажучы, памяшканне? Якое абсталяванне? Якія сродкі?.. І, дарэчы, на колькі адзінак разлічана прапускная здольнасць гэтага прадпрыемства?.. Колькі будзе наогул людзей, якія будуць мець патрэбу ў вашым прадпрыемстве?.. Ведаеце?.. Не?.. Выбачайце мяне, дарагія таварышы, але гэта не работа, не... чэснае слова, гэта трапатня...

Алёшка і Ігар у замяшанні маўчаць.

Ліпатаў задаволен тым, што яму ўдалося паставіць іх у тупік, кіўнуў галавой.

— Бывайце...

— Таварыш Ліпатаў, — пачаў Алёшка, — мы, можа быць, не ясна...

— Прыдзецца заўтра... — перапыніў яго Ліпатаў.

Ён паглядзеў на настольны календар.

— У тры пятнаццаць!.. — дадаў ён, — бывайце...

***

Ігар і Алёшка спыніліся на рагу з блакнотамі ў руках.

— Алёша! — сказаў Ігар, — мы будзем стаяць гадзіну... Уважліва запішам тых, якія маюць патрэбу ў кравецкай, шавецкай, у цырульнай... Колькасць маючых патрэбу за гадзіну мы памножым на сем і даведаемся, прыблізна, колькі людзей маюць патрэбу за дзень. Гэты лік памножым на 24 і нам ясна будзе, колькі ў нас будзе наведвальнікаў у месяц... Геніяльна, ці няпраўда?..

— Ігар! — усклікнуў Алёшка, уважліва гледзячы яму ў вочы — я баюся за цябе... ад геніяльнасці да вар'яцтва— адзін крок...

— Зусім правільна! — адказаў Ігар,— ад генія да вар'ята — адзін крок.

І каб злмераць адлегласць паміж ім і Алёшкай, ён шагнуў да яго і наступіў яму на нагу.

Алёшка заскакаў на адной назе.

— Касалапы!.. — крыкнуў ён, — ты мне заўсёды робіш непрыемнасці!..

— Выбачай, — сказаў Ігар, — забываю...

— Забываеш?.. Захварэў слабым розумам!..

— Ужо лепш слабым розумам, чым твой малы розум. — сказаў Ігар.

На гэтым дыскусія скончана.

Гадзіннік паказвае без двух мінут тры.

— Пачалі! — сказаў Ігар.

І сябры прыступілі да работы. Яны стаялі з абодвух бакоў тратуара і, прапускаючы кожнага праходзячага, аглядвалі з ног да галавы. Толькі і чуваць было, як яны перакідваліся словамі.

— Гладзіць!

— Брыць!

— Рамонт штаноў!

— Капітальны рамонт чаравікаў!..

Прахожыя неўразумена азіраліся, і, усміхаючыся незразумела чаму, адыходзілі.

Раптам Ігар спыніў праходзячага мужчыну сярэдніх год:

— Вы мне даруйце, — нясмела сказаў ён, — мне няёмка вам сказаць... але ў вас падраны рукаў...

— Дзякую, — адказаў прахожы, — шукаю майстэрню, — ніяк знайсці не магу...

— Я вам раю пачакаць,—умяшаўся Алёшка, — літаральна праз месяц ці два ў горадзе адкрыецца камбінат бытавога абслугоўвання... Сервіс!

— Сервіс... — радасна ўсміхнуўся прахожы.

— Перадайце, калі ласка, аб гэтым, — сказаў Ігар, — вашым родзічам і знаёмым.

— Дзякую! — ветліва раскланяўся прахожы і, прыкрыўшы рукой падраны рукаў, пайшоў.

І зноў сябры сталі запісваць:

— Гладзіць...

— Стрыжка...

— Рамонт абутку...

Да Ігара набліжалася тоўстая дама ў летнім плашчы дзіўнага фасону. Рукавы ў некаторых месцах былі адкрыты.

Ігар спыніў яе.

— Выбачайце, — сказаў ён ёй, — мне вельмі няёмка вам гаварыць аб гэтым... але ў вас падраныя рукавы...

Дама спалохана азірнулася.

— Што?.. Якое вы маеце права?.. Гэта апошняя мода!..

І, какетліва папраўіўшы рукавы, яна зняважліва паглядзела на Ігара і пайшла, пакінуўшы яго ашаломленым.

Алёшка пырснуў ад смеху.

Ігар (з гранічнай сур'ёзнасцю, зірнуўшы на яго): Чаго смяешся, дубіна!... У кожнай справе могуць быць промахі... Запісвай!...

І зноў сябры сталі запісваць:

— Прышыўка гузікаў!..

— Пераліцоўка!..

— Брыць!..

У гэты час Алёшка і Ігар яшчэ здалёк заўважылі шагаючага да іх грамадзяніна ў капелюшы і з упрыгожваючай яго французскай бародкай.

— Яшчэ раз брыць? — сказаў Алёшка.

— Што ты! — здзівіўся Ігар, — гэты грамадзянін бародку не зыме...

— Навошта яму гэта казліная барада? — не разумеў Алёшка, — ты за, а я— супроць... Запытаемся!

Ён спыніў грамадзяніна.

— Выбачайце, — сказаў Алёшка, — мы тут паспрачаліся..., ці маеце вы намер збрыць вашу бародку, ці не?..

Грамадзянін вытарашчыў на яго вочы:

— Навошта гэта вам трэба ведаць?..

— Бачыце, — умяшаўся Ігар, — гэта нам неабходна для падліку...

Пачуўшы гэта, грамадзянін кінуўся бегчы.

Ігар і Алёшка паглядзелі адзін на другога, глыбока ўздыхнулі і зноў прыняліся за работу.



У 1940 годзе Мінская студыя кінохронікі выпусціць на экраны рэспублікі 72 кінажурналы, 6 спецыяльных выпускаў і 2 кароткаметражных фільмы для саюзнага экрана.

На здымку: кінарэжысёр В. Стральцоў за мантажом кінажурнала.

Фота М. Савіна (БЕЛТА).



«Ідзе Чырвоная Армія!» Карціна мастака-самавучкі, б. польскага палітзняволенага **І. Д. Рудчыка.** Кансультыраваў мастак **Н. Гусеў** (творчы семінар пры Доме народнай творчасці БССР).

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

ДА ТРЫЦЦАЦІГОДДЗЯ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДАВІДА БЕРГЕЛЬСОНА

Совецкія пісьменнікі Беларусі горача вітаюць Вас, дарагі таварыш Бергельсон, у сувязі са споўніўшымся трыццацігоддзем Вашай плённай літаратурнай дзейнасці.

У Вашай асобе беларускія пісьменнікі вітаюць лепшага прадаўжальніка негаснучых класічных традыцый яўрэйскай літаратуры, нястомнага майстра, перабіраючага велізарныя пласты народнай мовы і ствараючага эстэтычныя каштоўнасці вялікага сэнсу і значэння. Вашы раманы «Отход», «У вакзала», «Все окончено» абагулянні ў вялікай колькасці выдатных мастацкіх вобразаў жыццё і быт яўрэйскага грамадства ва ўсіх яго відах і праявах. Надоўга застанецца ў памяці створаны Вамі паэтычны вобраз яўрэйскай жанчыны Мірэле Гурвіч, супроцьстаячай змроку і бруду абстуціўшага яе жыцця.

Радасна ведаць, што да трыццацігоддзя Вашай літаратурнай дзейнасці Вы прыйшлі з творам, які з'яўляецца дастойным вынікам пройдзенага Вамі шляху. Гістарычны раман «У Днепра» увойдзе ў скарбніцу вялікай яўрэйскай літаратуры творам вялікай манументальнай тэмы, упэўненага рэалістычнага майстэрства, невычарпальнага моўнага багацця.

Пажадаем Вам, дарагі юбіляр, яшчэ многіх, многіх год плённай работы на славу нашай выдатнай радзімы, на славу квітнеючай культуры соцыялізма.

Янка Купала, Якуб Колас, Зм. Бядуля, Кузьма Чорны, М. Лынькоў, З. Аксельрод, У. Фінкель, П. Броўка, Г. Камянецкі, В. Вольскі, П. Глебка, І. Гурскі, А. Куляшоў, М. Лійшыц, М. Танк, Я. Маўр, М. Клімковіч, М. Паслядовіч, Р. Брохес, Ф. Пестрак, А. Кучар, Хв. Шынклер, З. Каган, Г. Бярозкін, З. Целесін, М. Модэль, Л. Кацовіч, Р. Мурашка, Л. Талалай, М. Груб'ян, Г. Шведзік, І. Сярэбраны, Р. Баўмволь, С. Каган, П. Панчанка, Б. Гелер, Х. Мальцінскі, А. Платнер, Э. Агняцвет, Г. Рэлес, Ш. Берлінскі, А. Астрэйка, А. Якімовіч.

СОФ'Я ЛІСОЎСКАЯ

Соф'я Лісоўская—былая батрачка, малапісьменная, бяспраўная жанчына ў былой панскай Польшчы. На сваіх плячах адчуваючы ўвесь цяжар прыгнёту паноў і панскага ўрада над беларускімі працоўнымі ў Заходняй Беларусі, Соф'я Лісоўская чулай паэтычнай душой улоўлівала ў народзе ноты помсты, гневу, абурэння, ноты веры ў блізкае вызваленне, каб выказаць іх у вершах і песнях. Вершы яна вучылася складаць самавукам. Узорам для пераймання былі ёй творы Шэўчэнкі, Некрасава, Купалы. Складзеныя ёю вершы вусна распаўсюджваліся сярод рэвалюцыйнай моладзі, з імі яна выступала на вясковых вечарынках, на сходах моладзі.

Вершы Соф'і Лісоўскай далёкі яшчэ ад сапраўднага майстэрства, але ў іх жыве непадзельнае пачуццё, шчырасць. Калі ў сваіх ранейшых вершах паэтэса імкнулася выказаць думкі рэволюцыйнай моладзі аб свабодзе, аб барацьбе, дык цяпер з гэткім-жа імпэтам імкнецца яна апяваць пра здзейсненыя мары і надзеі.

Зараз Соф'я Лісоўская працуе ў рэдакцыі раённай газеты «Пабеда» у гор. Саколка, Беластоцкай вобласці. Друкуемыя два яе вершы даюць уяўленне аб ранейшай і сучаснай творчасці паэтэсы.

ДВА ВЕРШЫ

НЕ СУМУЙ

Не сумуй, братка мой, што загон родны твой
Патаптаны прыблудаў нагою,
А твой родненькі край, дармаедаў тых рай,
Перарэзан шырокай мяжою.

Не сумуй, што для нас светач сонца пагас,
Што ноч чорная вісне над краем,
А падзяка за труд—паняверка прыблуд,—
Вось усё, што за працу мы маем.

Можа, брак табе школ? Процьма іх наваколл,
Чаму-ж вучацца нашыя дзеткі?
Іх там вучаць адно—цягнуць шчыра ярмо,
Араць панскага поля палеткі.

Змалку вучаць іх там служыць шчыра панам,
Бо загад ёсць такі і ад бога,
Дык працуй ты на іх з усіх сілаў тваіх,
Не падумай нічога благога.

Не кажы, братка, ім аб цярпенні сваім,
Бо ты створан на то, каб цярпеці.
Не шкадуй сваіх рук, гні спіну ты у крук,
А па смерці дык рай будзеш меці.

Чаго бракне табе, што пяеш у жальбе
Песні суму, няволі і здзеку?
Заспявай весялей, мо на свеце мілей
Будзе жыць батраку-чалавеку.

Паглядзі на абшар, ты не раб, а ўладар,
Гэта ўсё, ўсё належыць табе.
Паглядзі на лясы—поўны дзіўнай красы!
Як-жа можаш цяць аб жальбе?

Памінула зіма, завітала вясна
І прыроду ад сну прабудзіла,
Ты на рэчку зірні, як свабодна бурліць,
Як зімы кайданы пакрышыла.

Рэчка рвецца з акоў, як-бы з пут чужакоў,
Вецер буйны гуляе па полі.
Хвалі бурна кіпяць, пырскі к небу ляцяць,
Як-бы цешацца з гэтае волі.

Дык прасніся з вясной, братка родненькі мой,
Ад зімовага сну ты прасніся,
Будзь ты роўны другім ў родным краю сваім
І к свабодзе арлом узнясіся.

Веру, ўстане Заход,—забіць вольны Усход,—
Разаб'ем наш няволі ланцуг.
Вольным будзе наш край, тут мы створыма рай
Без кайданаў, дратованых пуг.

1932 год.

З'ІСЦІЛІСЯ НАДЗЕІ

Вось край наш радзімы, дзе чуўся праклён,
Дзе жальбы спляталіся ў рыфмы,
Ажыў, заззвінеў новай сілаю дзён,
Пачуліся новыя рытмы.

А новыя думкі, нязнаныя тут,
Разліліся ў новыя песні...
Забылі пагарду даўнейшых пакут
І змылі спрадвечную плесень.

Звінела магутнаю хваляй, як гром,
Збавіцелям ўдзячнасць з Заходу.
Усё ажывала, ўставала кругом
Вітаці чакану свабоду.

І дзіўнай красою укрыўся наш край,
Чырвоныя сцягі рдзелі,
А людзі, як брацця сямейкі адной,
Адзіным жаданнем гарэлі.

Адзіна жаданне еднала людзей—
Жыць ў роднай сямейцы Советаў.
З'ісціліся думкі святляных надзей,
Прыйшлі да чаканае мэты.

Трынаццаць мільёнаў бяспраўных рабоў
Сягоння ўжо—вольныя дзеці.
І нашага шчасця і радасных дзён
Не струць ні гады, ні сталецці.

А сёння, пакуль у грудзях малады
Б'ецца сэрца і цепляцца сілы,—
Да працы! Да сонца! У нас-жа цяпер
Арліныя выраслі крыллі.

1940 год.

УМАЦАВАЦЬ ТВОРЧАЕ САДРУЖАСТВА ТЭАТРАЎ З ДРАМАТУРГАМІ

4 мая ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР адбылася нарада драматургаў сумесна з кіраўнікамі Упраўлення па справах мастацтваў БССР па пытанню ўдзелу драматургаў БССР ва Усесаюзным конкурсе на лепшую п'есу. Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. Азірскі зрабіў інфармацыю аб арыгінальных беларускіх п'есах у рэпертуары тэатраў рэспублікі бягучага года. Намеснік начальніка Упраўлення тав. Дадзіомава расказала драматургам аб рабоце аргкамітэта па правядзенню першага рэспубліканскага тура Усесаюзнага драматургічнага конкурса.

Абедзве гэтыя інфармацыі паказалі адно: паслабла работа пісьменнікаў у жанры драматургіі.

Чаму стварылася такое становішча? На гэта далі адказ выступаўшыя пісьменнікі таварышы Клімковіч, Маўр, Бядуля, Гурскі, Ільінскі, Аксельрод, Фінкель і іншыя.

Яны адзначылі, што і Упраўленне па справах мастацтваў, і кіраўнікі тэатраў за апошні час не ўдзяляюць патрэбнай увагі рабоце з драматургамі, не клапоцяцца пра ўстанаўленне творчых сувязей між тэатрамі і драматургамі, пра вырошчванне новых, маладых кадраў драматургаў. На раўнадушнасць, якую сустракае пісьменнік, пачаўшы работу ў драматургіі, указвалі т. т. Маўр, Ільінскі, Фінкель, ілюстрыруючы гэта прыкладамі ўласных, часамі бескарысных пошукаў увагі і падтрымання з боку тэатраў. Ёсць рад п'ес, якія дагэтуль не трапілі на сцэну і аўтары якіх пакінуты без увагі. І ўсё гэта ў той час, калі большасць тэатраў рэспублікі, у першую чаргу калгасныя і абласныя, не маюць у сваім рэпертуары ў 1940 годзе ніводнай арыгінальнай п'есы. Узнялі пытанне аб неабходнасці большых клопатаў да развіцця тэатральнай крытыкі т. т. Модэль, Бярозкін.

Заахвочваць пісьменнікаў да напісання п'ес, дапамагаць драматургам, устанавіць сапраўдную творчую сувязь між тэатрамі і драматургамі—вось умовы, якія, па думцы выступаўшых, забяспечаць плённую творчую работу па далейшаму ўзбагачэнню нашай драматургіі.

***

Тэрмін першага рэспубліканскага тура Усесаюзнага конкурса канчаецца 1 верасня 1940 года. П'есы, прэміраваныя і рэкамендаваныя журы БССР, прадстаўляюцца на разгляд журы Усесаюзнага конкурса к 1 лістапада 1940 года.

На конкурс прымаюцца арыгінальныя драматургічныя творы, напісаныя на любую тэму і ў любым жанры (драма, камедыя, вадэвіль і г. д.) на адной з моў народаў СССР.

За лепшы драматургічны твор устаноўлены прэміі: адна першая—25.000 рублёў, дзве другіх па 15.000 рублёў і дзве трэціх па 7.000 рублёў. Апрача таго, устанаўліваецца заахвочваючая ўзнагарода за п'есы, рэкамендаваныя журы для пастаноўкі ў тэатрах, але не ўдастоеныя прэміі. Рукапісы твораў павінны прадстаўляцца пад дэвізам.

А. М.

П'есы і песні для дзяцей

Закончыўся конкурс на лепшую п'есу і песню для школьных драматычных і харавых гурткоў, абвешчаны ЦК ЛКСМБ, Наркамасветы, Упраўленнем па справах мастацтваў, Саюзам совецкіх пісьменнікаў, Аргкамітэтам саюза совецкіх кампазітараў і рэдакцыяй газеты «Піонер Беларусі».

На конкурс паступіла 92 п'есы, 37 песень (музычных твораў) і 27 тэкстаў песень.

Рашэннем журы прэміраваны лепшыя п'есы: «Чалавек-невідзімка» А. Якімовіча і «Майстар на ўсе рукі» Шведзіка і Мальцінскага (другая прэмія), «Хата з краю» Янкі Маўра, «Клад» І. Гурскага і «Знойдзены кут» В. Краўчанкі (трэцяя прэмія). Пяць п'ес: «Генерал» Н. Наумчыка, «Простыя хлопцы» М. Паслядовіча, «Таварышам насустрач» Шведзіка і Мальцінскага, «Дарагая дачушка» Янкі Маўра і «Рыбакі» Якімовіча рэкамендаваны да друку.

Першую прэмію за лепшую песню (музыку) атрымаў кампазітар Туранкоў («Піонерская песня»), дзве другія прэміі—кампазітар Чуркін («Марш юнацтва» і «Магіла Міколы»), трэція прэміі—кампазітар Лістоў («Песня алімпіяды») і Туранкоў («Крыніцы»).

Другую прэмію за лепшы тэкст песні (першая нікому не прысуджана) атрымаў Я. Рыўкін за «Піонерскую песню», трэцюю прэмію — А. Бялевіч — за тэкст песні «Дзень добры, дубрава».

Рад песень — Палонскага, Пракоф'ева, Рубіна і Чуркіна рэкамендаваны да друку.

Вечары кінодраматургаў

Совет клуба пісьменнікаў і сцэнарны аддзел кінастудыі «Совецкая Беларусь» намецілі правесці рад творчых вечароў кінодраматургаў БССР.

Першы вечар арганізуецца 11 мая ў 8 гадзін вечара ў Доме пісьменнікаў.

Пісьменнік Л. Кацовіч прачытае сваю кінокамедыю «Людзі маленькага горада».

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і мясцком профсаюза работнікаў друку пры ССП БССР выражаюць спачуванне пісьменніку МІКОЛУ ЦЭЛЕШУ з поваду смерці яго жонкі.

Рэдакцыя літаратурна-драматычнага вяшчання Радыёкамітэта пры СНК БССР выражае глыбокае спачуванне пісьменніку М. ЦЭЛЕШУ з прычыны заўчаснай смерці яго жонкі ВАРВАРЫ ІВАНАЎНЫ.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № М—1779.